ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 97 (2046)
3 снежня 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

5 СНЕЖНЯ — ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

ЗАКОН НАШАГА ЖЫЦЦЯ

Толькі што беларускія пісьменнікі сустрэлі сваіх таварышаў — удзельнікаў Тыдня беларускай літаратуры ў Таджыкістане. Сем дзён у краіне гранатавых гаёў, аснежаных горных вяршынь і плантацый белага золата — бавоўны — гучала слова зямлі, якая раскінулася за тысячы кіламетраў ад Таджыкістана, зямлі празрыстай азёрнай сіні і задумных векавых дуброў. Хвалюючыя, радасныя сустрэчы пад ласкавым таджыкскім небам назаўсёды засталіся ў сэрцах іх удзельнікаў — як беларускіх гасцей, так і таджыкскіх гаспадароў.

Напярэдадні 5 снежня — Дня Савецкай Канстытуцыі — свята беларускай літаратуры ў Таджыкістане ўспрымаеш як выразнае, харошае сведчанне дружбы сацыялістычных культур, дружбы савецкіх народаў. І ўспамінаеш, што дружба, братэрства, еднасць сям'і савецкіх народаў — адна з найвялікшых заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі, запісаная ў Асноўным Законе нашага жыцця — Савецкай Канстытуцыі.

У сваіх напружаных стваральных днях мы часта не задумваемся пра вытокі з'яў, якія здаюцца нам звыклымі, звычайнымі. Гарантаваныя кожнаму савецкаму грамадзяніну правы — на працу, на адпачынак, на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці — здаюцца нам такімі ж спрадвечнымі, такімі ж само сабой зразумелымі, як тое, што мы дыхаем, гаворым, смяёмся. Але чаму ж так уражаюць яны зарубежных сяброў, што ўпершыню сутыкаюцца з нашым грамадствам, з прынцыпамі, па якіх яно жыве? А іменна таму, што Канстытуцыя СССР — найярчэйшае ўвасабленне імкненняў і спадзяванняў лепшых розумаў чалавецтва, высокі прыклад здзяйснення палымяных лозунгаў, што напісаны былі на сцягах змагароў супраць царызму і капіталізму, што і сёння напісаны на сцягах народаў, якія ўзнімаюцца на барацьбу за светлую будучыню.

Іменна Савецкая улада — і гэта напярэдадні свята прыемна ўсвядоміць яшчэ і яшчэ раз — не на словах, а на справе забяспечыла працоўным правы, якіх не давала ні адна ўлада ў свеце. Іменна Савецкая улада вывела рабочых, сялян, інтэлігенцыю на дарогу свядомай гістарычнай творчасці. Сацыялістычная дэмакратыя — гэта дэмакратыя першай у гісторыі чалавецтва дзяржавы, дзе гаспадаром жыцця — народ.

«Калі старыя буржуазна-дэмакратычныя канстытуцыі распісвалі, напрыклад, фармальную роўнасць і права сходаў, — наша, пралетарская і сялянская, Савецкая канстытуцыя адкідае крывадушнасць фармальнай роўнасці прэч, — гаварыў Уладзімір Ільіч Ленін. — Грош цана «свабоды сходаў» для рабочых і сялян, калі ўсе лепшыя будынкі захоплены буржуазіяй. Нашы Саветы адабралі ўсе добрыя будынкі, і ў гарадах і ў вёсках, у багачоў, перадаўшы ўсе гэтыя будынкі рабочым і сялянам пад іх саюзы і сходы. Вось наша свабода сходаў — для працоўных! Вось сэнс і змест нашай Савецкай, нашай сацыялістычнай Канстытуцыі!

І вось чаму так глыбока ўпэўнены ўсе мы, што якія б беды ні абрушыліся яшчэ на нашу рэспубліку Саветаў, яна непераможна».

Калі акінуць вокам гісторыю Савецкай улады — ад першых Саветаў легендарнага ўжо 1905 года да ўсенароднай сацыялістычнай дэмакратыі нашых дзён — то формы дзяржаўнага кіравання ў нашай краіне не раз мяняліся, развіваліся, удасканальваліся. Але якімі б ні былі гэтыя змены, рэвалюцыйныя, ленінскія, народныя першаасновы нашай дзяржавы застаюцца нязменнымі. Першаасновы, грунт якіх, паводле слоў Ул. І. Леніна, — «самаўладства народа». Першаасновы, якія перад кожным чалавекам адкрываюць самыя шырокія перспектывы.

Усё для чалавека, усё ў імя чалавека! — вось найпершы закон нашага савецкага жыцця. Але забяспечваючы працоўным вялікія правы, савецкая дэмакратыя ўскладае ў той жа час на іх адказныя абавязкі. «Хто не працуе, той не есць» — з гэтымі словамі ішлі на штурм Зімняга нашы дзяды, гэтыя словы сталі і заўсёды будуць вышэйшым прынцыпам жыцця ў нашай краіне. Праца на карысць грамадства — свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна. І справа гонару працаўнікоў літаратуры і мастацтва — выхоўваць савецкіх людзей у духу глыбокай павагі да гэтага абавязку, у духу калектывізму, усведамлення сваёй прыналежнасці да самага перадавога ў свеце грамадства, у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, захавання высокіх прынцыпаў маральнага кодэкса будаўніка камунізма.

Шмат урачыстых песень, шмат натхнёных паэтычных радкоў прысвечана Канстытуцыі Краіны Саветаў. Дзень Канстытуцыі мы адзначаем як выдатнае свята сацыялістычнай дэмакратыі, свабоды і велічы савецкага чалавека.

Радзіма наша рыхтуецца цяпер да знамянальнай вяхі ў сваёй палымянай гісторыі — XXIII з'езда Камуністычнай партыі. Прыемна ўсведамляць тыя велізарныя дасягненні, з якімі сустракаюць партыя і народ гэтую важнейшую не толькі для нашай Айчыны, але і для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва падзею. Прыемна ўсведамляць, што неад'емнай частачкай гэтых поспехаў з'яўляецца праца кожнага з нас.

Да працы, да творчага гарэння і абавязвае нас Асноўны Закон, па якім жыве наша дзяржава. Да гэтага абавязвае нас сыноўняя любоў да Радзімы, адданасць справе Камуністычнай партыі.

ДАРОГІ Ў СВЕТ ПРЫГОЖАГА

У МІНСКУ ПРАХОДЗІЦЬ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ЭСТЭТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ ШКОЛЬНІКАЎ

Як навучыць будучага будаўніка камунізма распазнаваць сапраўды прыгожае, адгукацца на яго ўсімі сваімі начуццямі, быць актыўным змагаром за гэтае прыгожае і самому, развіваючы свае творчыя здольнасці, узбагачаць яго — гэтым клопатам занята сёння шмат людзей нашай краіны і ў першую чаргу настаўнікі, работнікі мастацтва, літаратуры, устаноў культуры. Многае тут залежыць ад школы, у сценах якой чалавек атрымлівае першае ўяўленне аб прыгожым.

Чытачы газеты «Літаратура і мастацтва», мабыць, памятаюць артыкулы і выступленні на яе старонках пад рубрыкай «Дарогі ў свет прыгожага». Сур'ёзная размова аб шляхах практычнага авалодання кожным маладым чалавекам эстэтычнай скарбніцай чалавецтва выклікала тады многа роздуму, заўваг, прапаноў ва ўсіх, хто знаёміўся з матэрыяламі дыскусіі, хто зацікаўлены, каб імкненне да прыгожага стала рысай кожнага савецкага маладога чалавека. Тады ж упершыню і прагучала думка аб неабходнасці шырокага рэспубліканскага форуму людзей, ад якіх найбольш залежыць практычнае выхаванне правільных эстэтычных густаў моладзі.

Пазаўчора, 1 снежня, такі форум адкрыўся. У Мінску пачалася першая Рэспубліканская навукова-педагагічная канферэнцыя па эстэтычнаму выхаванню, скліканая Міністэрствам асветы БССР і яго навукова-даследчым Інстытутам педагогікі. У падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі прымаюць удзел і творчыя саюзы рэспублікі—пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, прадстаўнікі якіх выступаюць на канферэнцыі з лекцыямі, дакладамі, гутаркамі, будуць кіраваць секцыямі. На канферэнцыю прыехалі таксама прадстаўнікі навукова-даследчых інстытутаў мастацкага выхавання і псіхалогіі Масквы, Свярдлоўска, братніх рэспублік.

У зале Мінскага Дома палітычнай асветы сабралася звыш 350 чалавек — настаўнікі і дырэктары пачатковых, васьмігадовых і сярэдніх школ, работнікі аддзелаў народнай асветы. Многія з іх прымуць непасрэдны ўдзел у абмеркаванні праблем эстэтычнага выхавання, падзеляцца сваім вопытам на пасяджэннях секцый.

Наш карэспандэнт звярнуўся да некаторых удзельнікаў канферэнцыі з пытаннем, што яны чакаюць ад канферэнцыі. Вось што яму адказалі.

Іван Рыгоравіч Анікеіч, дырэктар Свяцілавіцкай сярэдняй школы Веткаўскага раёна:

— Вельмі многа. Я, ды і ўсе мае калегі — сельскія настаўнікі спадзяюцца пачуць шмат карыснага. Умовы эстэтычнага выхавання ў нас усё-такі горшыя за магчымасці гарадскіх школ.

У гутарку ўмешваецца Алена Антонаўна Карандзей, дырэктар сярэдняй школы № 9 г. Мінска:

— Не думаю, што мне будзе менш цікава, чым вам. Праграма канферэнцыі ахоплівае пытанні, якія хвалююць і нас, гарадскіх настаўнікаў.

Людміла Віктараўна Цярпіцкая, настаўніца спеваў Мялешкавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна:

— А я проста рада прысутнічаць пры размове, якая, адчуваю, і падкажа мне, і натхніць. Я ж першы год працую...

Нібы адказваючы ім, дырэктар навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР Пётр Спірыдонавіч Сонцаў сказаў карэспандэнту:

— Канферэнцыя павінна падагуліць дасягнутае ў справе эстэтычнага выхавання моладзі, выявіць і памагчы распаўсюдзіць лепшы вопыт, даць педагогам каштоўныя парады і рэкамендацыі.

Канферэнцыю адкрыў уступным словам міністр асветы БССР Р. Я. Кісялёў.

У першыя два дні работы ўдзельнікі канферэнцыі праслухалі даклады намесніка дырэктара навукова-даследчага Інстытута мастацкага выхавання Акадэміі педагагічных навук РСФСР, кандыдата філасофскіх навук В. А. Апраксінай «Мэты і задачы эстэтычнага выхавання школьнікаў», доктара педагагічных навук П. М. Якабсона «Псіхалагічныя асновы эстэтычнага выхавання школьнікаў», навуковага супрацоўніка Інстытута мастацкага выхавання Акадэміі педагагічных навук РСФСР І. І. Далецкай «Мастацкая літаратура як сродак выхавання», доктара мастацтвазнаўства Ул. І. Няфёда «Роля савецкай драматургіі і савецкага тэатра ў фарміраванні эстэтычных густаў моладзі», настаўніцы сярэдняй школы № 35 г. Мінска Я. В. Перавознай «Эстэтычнае выхаванне на ўроках літаратуры», музыказнаўцы Л. Д. Аўэрбаха «Музычнае выхаванне вучняў», народнага артыста СССР Р. Р. Шырмы «Песня як фактар эстэтычнага выхавання», загадчыка сектара выяўленчага мастацтва Інстытута мастацкага выхавання Акадэміі педагагічных навук РСФСР Ус. В. Калакольнікава «Эстэтычнае выхаванне вучняў сродкамі выяўленчага мастацтва», старшыні праўлення Саюза мастакоў БССР Ул. І. Стальмашонка «Выяўленчае мастацтва ў школе», старшыні праўлення Саюза архітэктараў БССР Э. М. Дзямідава «Архітэктура і фарміраванне эстэтычнага густу», настаўніцы Азярышчанскай сярэдняй школы Гарадоцкага раёна Н. Д. Сідаравай «Аб рабоце класнага кіраўніка па эстэтычнаму выхаванню».

Канферэнцыя працягваецца.

ВУЧОБА САМАДЗЕЙНЫХ МАСТАКОЎ

Самадзейныя мастакі Віцебшчыны рыхтуюцца да юбілейнай выстаўкі народных умельцаў, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады. Але многім з іх яшчэ патрэбны кваліфікаваная дапамога і кансультацыі. З гэтай мэтай у Полацку быў праведзены пяцідзённы куставы семінар, скліканы абласным Домам народнай творчасці. Самадзейных мастакоў—а іх было каля 30 чалавек — кансультавалі метадыст Б. Скуловіч і выкладчык В. Шаталаў.

Вельмі карыснымі былі гутаркі пра творчасць беларускіх майстроў жывапісу, пра гісторыю стварэння многіх вядомых карцін. Удзельнікі семінара падзяліліся творчымі задумамі.

А. КАРАНДЗЕЙ.

ЭСТАФЕТА ДОБРЫХ СПРАЎ

Гэта мерапрыемства рыхтуюць работнікі культасветустаноў Лагойскага раёна. Эстафета пабывае ў 19 сельгасарцелях, 10 саўгасах і на многіх прадпрыемствах. За гэты час будуць падведзены вынікі работы сельскіх дамоў культуры, калгасных клубаў і бібліятэк, праведзены агляды калектываў мастацкай самадзейнасці. Работнікі ўстаноў культуры абмяняюцца вопытам арганізацыі масавых мерапрыемстваў.

ТЭМАТЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫ

Тураўская занальная і Верасніцкая сельская бібліятэкі разам з партыйнымі арганізацыямі калгасаў «Новае жыццё» і імя Жданава рыхтуюць вечары на тэму «Наш калгас ад XXII да XXIII з'ездаў КПСС». На вечарах працаўнікі палёў і мясцовая інтэлігенцыя раскажуць пра тыя змены ў жыцці вёсак, якія адбыліся паміж з'ездамі.

ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ВАЗЫ І СУВЕНІРЫ

Наш карэспандэнт папрасіў старшага эканаміста Барысаўскага шклозавода імя Дзяржынскага Алену Сцяпанаўну Шабіш расказаць, як рыхтуюцца да XXIII з'езда КПСС майстры мастацкага шкла і крышталю. Вось што яна паведаміла...

— Перш за ўсё хочацца адзначыць працоўны ўздым, якім ахоплены шкловары, штампоўшчыкі, граміроўшчыкі, мастакі. Цэх ручной выпрацоўкі штодзённа адсылае гандлёвым арганізацыям каля 20 тысяч адзінак розных вырабаў. Асабліва прыемны выгляд у вазы для кветак. Мастакі ўпрыгожылі яе малюнкам манумента Перамогі ў Мінску. Сувенірныя шклянкі аздоблены малюнкамі беларускага нацыянальнага танца «Лявоніха» і зубра.

«НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕЦЕ» — ДВАЦЦАЦЬ ГОД

Споўнілася дваццаць гадоў з дня выхаду першага нумара «Настаўніцкай газеты». За заслугі ў развіцці народнай асветы рэспублікі і камуністычным выхаванні педагагічных кадраў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў «Настаўніцкую газету» Ганаровай граматай.

Ад невялікіх майстэрань да буйнога сучаснага прадпрыемства, першакласныя металарэзныя станкі якога ідуць у многія краіны свету,— такі шлях Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава. У гэтыя дні калектыў нясе працоўную вахту ў гонар XXIII з'езда КПСС.

Сярод перадавіноў завода і слесар-зборшчык, ударнік камуністычнай працы Валянцін Гарох. Штодзённа ён на 40—50 працэнтаў перавыконвае зменныя заданні.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

У «ДРУЖБЕ НАРОДОВ» 1966 ГОДА

Імёны беларускіх пісьменнікаў даволі часта з'яўляюцца на старонках часопіса «Дружба народов». Так, у гэтым годзе чытачы часопіса маглі пазнаёміцца з раманам Міколы Лобана «На парозе будучыні», з аповесцю Івана Пташнікава «Лонва», з апавяданнямі Міколы Ракітнага.

Нядаўна адбылося пасяджэнне рэдкалегіі «Дружбы народов», на якім быў абмеркаваны план работы часопіса на будучы год. У 1966 годзе чытачы зноў убачаць на старонках «Дружбы народов» нямала імён беларускіх пісьменнікаў. У прыватнасці тут будуць надрукаваны другая кніга «палескай хронікі» Івана Мележа «Подых навальніцы», нізкі новых вершаў Петруся Броўкі і Максіма Танка, урыўкі з дзённіка Кузьмы Чорнага, аповесць Івана Шамякіна «Мост». Пад рубрыкай «Людзі, падзеі, час» будзе змешчаны нарыс Ігната Дуброўскага «Зямныя вузлы». Нямала месца будзе адведзена таксама творам маладых беларускіх аўтараў.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ. БРЭСЦКІ ІНЖЫНЕРНА-БУДАЎНІЧЫ

На ўскраіне Брэста растуць карпусы новага інжынерна - будаўнічага інстытута, у якім будуць займацца 1 250 студэнтаў на дзённым аддзяленні і паўтары тысячы — на вячэрнім і завочным. Гэты інстытут будуецца па праекце Брэсцкага аблпраекта. Яго аўтары — галоўны архітэктар З. Леўчанка і галоўны інжынер Л. Лепяшкевіч. Узяўшы за аснову тыпавы праект, яны значна яго перарабілі, бо ён не падыходзіў па сваіх тэхнічных і функцыянальных якасцях.

Будынак новага інстытута будзе мець пяць паверхаў (цяпер пачалася кладка трэцяга). Тут размесцяцца вучэбныя аўдыторыі і навуковыя лабараторыі, актавая зала на 800 месц, фізкультурная зала, адміністрацыйныя памяшканні. Цэнтральная частка заніжанага крыла будынка адводзіцца пад бібліятэку і кнігасховішча. Па тыпавым праекце актавая зала павінна была мець толькі адкрытую эстраду. Брэсцкія ж архітэктары вырашылі пабудаваць вялікую сцэну. Яны значна перарабілі і вестыбюль (гардэроб, на прыклад, зусім вынесены з яго).

Па галоўным фасадзе будынка прадугледжаны пілоны, якія нададуць яму стройнасць, узнёсласць. Стужкі вокнаў чаргуюцца з гарызантальнымі бетоннымі паясамі. Актавая і чытальная залы будуць мець суцэльнае вітрыннае шкло ў металічным пераплёце. За галоўным корпусам інстытута пачалося таксама будаўніцтва інтэрната для студэнтаў.

Будынак інжынерна-будаўнічага інстытута, які выходзіць на Маскоўскую шашу, упрыгожыць уезд у Брэст.



Малюнак архітэктара В. СЕЛІВАНЦА.

ТРАДЫЦЫЯ—ЗНАЁМІЦЬ З НАВІНКАМІ

На чарговай музычнай «серадзе» ў Саюзе кампазітараў БССР па заведзенай ужо традыцыі адбыўся паказ навінак беларускай музыкі. На гэты раз кампазітары, музыказнаўцы, студэнты старшых курсаў кансерваторыі праслухалі фартэпіннае трыо Д. Камінскага, дзве навелеты для віяланчэлі ў суправаджэнні фартэпіяна А. Янчанкі і дзве песні Ю. Семянякі—«Пад дажджом» (словы С. Грахоўскага) і «Бярозка» (словы М. Алтухова).

Трыо Д. Камінскага ўдала, з добрым настроем выканалі Л. Гарэлік (скрыпка), Е. Эфрон (фартэпіяна) і С. Мадорскі (віяланчэль). Як адзначалася на абмеркаванні, у гэтым музычным жанры нашы кампазітары ўжо шмат гадоў не пісалі. І тым больш прыемна, што напісаны Д. Камінскім фартэпіянны твор, па агульным прызнанні прысутных адпавядае высокім ідэйна-мастацкім патрабаванням. Трыо вылучаецца эмацыянальнай глыбінёй і сімфанічнасцю, яснай канструкцыяй і цэласнасцю ўсіх трох частак. Музыка яго не можа пакінуць раўнадушным кожнага, хто яе слухае. Пра гэта гаварылі Л. Аўэрбах, Я. Цікоцкі, Н. Калеснікава і іншыя.

Віяланчэльныя навелеты А. Янчанкі (іх сыграў Я. Сасім, акампаніраваў аўтар) былі таксама прыхільна сустрэты таварышамі па працы. Гэтыя невялікія, але выразныя музычныя апавяданні прываблiваюць сваёй арыгінальнай задумай і яркімі сродкамі мастацкага ўвасаблення тэмы.

Стрымана былі прыняты дзве лірычныя песні Ю. Семянякі, якія, відаць, напісаны для выканання ў эстрадных канцэртах (іх праспяваў саліст А. Бокаў). Асабліва многа заўваг было выказана на абмеркаванні песні «Бярозка», у якой шмат сентыментальнасці і чуюцца даўно знаёмыя музычныя інтанацыі.

Пасля праслухоўвання і абмеркавання новых музычных твораў у зале Саюза кампазітараў адбылася сустрэча з прадстаўнікамі пагранічных войск.

КІНАФЕСТЫВАЛЬ, ПРЫСВЕЧАНЫ ГЕРОЯМ-ЧЭКІСТАМ

Прэм'ерай мастацкага кінафільма «Як вас цяпер называць?» пачаўся 28 лістапада ў Мінскім клубе імя Дзяржынскага кінафестываль, прысвечаны героям-чэкістам. У час фестывалю, які праходзіць ва ўсіх кінатэатрах нашай рэспублікі, гледачы ўбачаць больш дваццаці мастацкіх і хранікально-дакументальных фільмаў аб верных сынах Радзімы — чэкістах. Сярод іх яшчэ адзін новы фільм — «Гульня без правілаў».

Жаўрыкаванне ў «Полымі»

ЧАС ІДЗЕ, РАМАН РАЗГОРТВАЕЦЦА

Р. БЯРОЗКІН

У ТРОХ апошніх нумарах часопіса «Полымя» надрукаваны працяг палескай хронікі Івана Мележа — раман «Подых навальніцы».

Не пабаюся сказаць, што гэтага рамана нецярпліва чакалі ўсе, хто перад тым прачытаў першую частку хронікі—«Людзі на балоце». Чакалі па-рознаму, на розных, так сказаць, узроўнях, але аднолькава законных у дачыненні да літаратуры з вялікім «заводам» праўды.

Прастадушнае чытацкае імкненне дазнацца, куды павернецца сюжэт, як разгорнуцца падзеі, спалучалася з не менш актыўным жаданнем уявіць, на якіх прасторах раскінецца, якія пласты жыцця сацыяльнага здолее падняць **раманная** думка твора.

І вось ён прачытаны, гэты новы твор Івана Мележа,—звяно ў шырока задуманай эпапеі жыцця чалавечага, жыцця народнага.

За многімі галасамі, што гучаць са старонак рамана «Подых навальніцы», выразна чуцен і звернуты да чытачоў «закадравы» голас аўтара: «Я знаю, вам спадабаўся мой першы раман, і, вядома, мяне гэта радуе. Але я не хачу, каб зробленае мною ў новай кнізе ацэньвалася толькі з пункту гледжання, нагадвае ці не нагадвае яно «Людзей на балоце». Новыя задачы вымагалі новых рашэнняў, і з улікам іменна гэтых задач падыходзьце да рамана, у які—магу вас упэўніць—укладзена шмат перажытага, перадуманага...»

Так ці прыблізна так, гаворыць нам пісьменнік, і мы разумеем яго, згаджаемся з ім.

«Людзі на балоце» — пераважна бытавы, сямейна-псіхалагічны раман з глыбокім і моцна выяўленым сацыяльным зместам. Дзея яго адбываецца паміж «сваімі», паміж людзьмі-суседзямі ў адной невялічкай палескай вёсцы, адгароджанай ад вялікага свету дрыгвой, забабонамі, коснасцю. Праўдзіва, праз усебакова даследаваныя характары, Мележ паказаў, як пад уздзеяннем рэвалюцыі пачынае змяняцца жыццё ў Куранях, як адступаюць няроўнасць, цемра, галеча.

У «Людзях на балоце» старое і новае відавочна процапастаўлены па значэнню, па перспектывах далейшага гістарычнага развіцця. Але ў мастацкім сэнсе іх яднае адзінства раманнага рытму, тая эпічная манера Мележавага пісьма, якая ўзнаўляе жыццёвы паток ва ўсім багацці яго лакальных адзнак, а ў якасці прадмета адлюстравання бярэ толькі «блізкія» з'явы, толькі факты, што не выходзяць за межы куранёўскага вопыту.

Праўда, і ў «Людзях на балоце» дзейнічаюць такія героі, як камуніст Апейка, чые жыццёвыя погляды сягаюць далёка за межы Куранёў, але **сюжэтная** роля гэтага персанажа ў рамане не вызначаецца яшчэ высокай актыўнасцю. І тое, што стаіць **за** ім, за Апейкам, турбуе куранёўцаў пакуль што ў той толькі меры, у якой яно закранае іх бліжэйшыя, практычныя інтарэсы, і не больш.

Між тым час ішоў, гістарычная сітуацыя ўскладнялася, а разам з ёю ўскладняліся і ўзаемадачыненні кожнага асобнага чалавека з тым, што прынята называць тыповымі абставінамі. Яны незвычайна пашырыліся, гэтыя абставіны: блізкае перапляліся з далёкім, прыватнае—з агульным, куранёўскае—з дзяржаўным.

Паказваючы значэнне і сэнс, скажам, такой падзеі, як будаўніцтва грэблі, Мележ цалкам заставаўся на куранёўскай глебе, побач з мясцовым энтузіястам Міканорам, нават з недаверлівым, цяжкадумным Васілём. Каб разабрацца ў падзеях калектывізацыі, пісьменнік адчуў патрэбу падняцца да Апейкі, але падняцца, не толькі не пагарджаючы Куранямі, не адрываючыся ад іх, а наадварот, усяляк сцвярджаючы шчасце і будучыню Куранёў як мэту ўсіх намаганняў народа, дзяржавы...

Так, думаецца мне, узнік і рэалізаваўся замысел новага рамана Івана Мележа «Подых навальніцы». Раман, які, магчыма, дзе-нідзе і страціў (параўноўваючы яго з «Людзьмі на балоце») у сэнсе шматфарбнай эпічнай карцінасці і паўнаты, затое набыў грамадзянскую значнасць і вастрыню праблем, што хвалююць і сёння.

ВОСЬ мы гаворым: будучыня Куранёў—мэта ўсіх намаганняў народа, калі пад народам разумець не абстракцыю, а пад Куранямі не проста гняздо перажыткаў і цемнаты, а жывую, хоць і «трудную», частку гэтага народа.

Бясспрэчна ясная, здавалася б, думка, якая наўрад ці сёння будзе выклікаць сумненні. Але іменна **сёння**. У той час і ў тых умовах, пра якія расказвае Мележ, гэту думку трэба было адстаяць камуністам-ленінцам Апейкавага тыпу ад «тэорый», і практыкі некаторых дзеячоў, што ўзяліся «ашчаслівіць» Курані без усякай веры ў іх, без неабходнай чуласці ў падыходзе да масы, без умельства зазірнуць ў заўтрашні дзень...

Непасрэдная тэма «Подыху навальніцы»—калектывізацыя ў Куранях. Пра гэты вырашальны і драматычны перыяд у гісторыі нашай краіны напісана, як вядома, нямала твораў—моцных і слабых, праўдзівых і непраўдзівых.

У асобных мясцінах рамана, асабліва там, дзе гаворка ідзе пра справы маладога калгаса, Мележ не адкрывае, на жаль, новага, а паўтарае напісанае іншымі, прычым не самае лепшае.

«Міканорава хата ўсё больш станавілася як бы цэнтрам тых, хто пайшоў у калгас. Сюды збіраліся на сходы, на нарады, нярэдка збіраліся і проста так. Пайсці ў Міканораву хату рабілася як бы прывычкай. Вечарамі ў Міканоравай хаце цяпер век свяціліся вокны, век гаманілі, меркавалі пра нешта калгасаўцы...»

Усё гэта пераказачна, бледна і неяк адразу ўзята ў «гатовым» выглядзе, як вынік, а не як працэс. Чалавеку, які будзе меркаваць аб рамане ў цэлым па прыведзеным урыўку, можа здацца, што Мележ аблегчана, бегла малюе першыя крокі калгаса і адносіны да яго куранёўцаў. Але гэта не так.

Усімі «вясковымі» раздзеламі кнігі аўтар дае нам адчуць характэрную для тых гадоў атмасферу разваг, сумненняў, цяжкіх бяссонных дум, бясконцых ваганняў, вострых канфліктаў, што часам завязваліся ў адной сям'і, пад страхою сялянскай хаты, нялёгкага развітання з мінулым і чакання, чакання...

Няздольныя, натуральна, зразумець адразу **дзяржаўны** сэнс калектывізацыі, куранёўцы, тым не менш, ішлі ў калгас, бо вельмі ўжо непрыглядным, няпэўным, быў іх учарашні дзень, і гэта ярка, у поўнай адпаведнасці з праўдай гісторыі паказвае нам Мележ. Паказвае ён, адна і другое: тую прывязанасць да **свайго**, да ўласнага, якая на працягу стагоддзяў фарміравала маральныя ўстоі сялянства і якая не магла не прымяшацца горкім смуткам ды роздумам нават да самых рашучых учынкаў самых празорлівых куранёўцаў. А што тады казаць пра «сярэдніх», «тыповых», хто і здагадацца не мог, быццам існуюць шляхі да шчасця і дабрабыту інакшыя, чым тыя, якімі імкнуліся—і часцей беспаспяхова—ісці многія пакаленні сялян...

Дык вось—Курані на мяжы 20-х і 30-х гадоў, разгубленасць і рашучасць, страх і надзея, велізарны разлом у адвечным жыццёвым укладзе, у побыце, у душах, і адчуваннем гэтага разлому прасякнута літаральна ўсё аж да самых асабістых узаемаадносін людзей, да кахання ў тым ліку.

Калі адзін з нашых крытыкаў пісаў у сувязі з «Людзьмі на балоце», што «аўтар толькі карэкціруе плынь жыцця адпаведна сваёй задуме рэалізаваць пэўныя ідэі», то гэта быў узор крытычнага «непападання», аналізу «міма». Сіла Мележа якраз у адваротным: у рэдкім умельстве ўзнаўляць трапяткую, рэальную плынь жыцця, яе складаную, «нескарэкціраваную» самацэннасць, якая сама нясе ў сабе ідэю, а не падганяецца пад яе. Так было ў «Людзях на балоце», так ёсць і ў тых раздзелах новага рамана, дзе малюецца вёска, людзі ў нялёгкіх варунках першай калгаснай восені, на пераломе і раздарожжы.

Жыццё, не спыняючыся, ідзе сваім ходам: нараджаюцца дзеці; у бедняка, цяпер калгасніка, Хоні памірае маці; сам ён, камсамолец, энтузіяст калектыву, упадабаў Хадоську, дачку не сказаць кулака, а чалавека, рэзка непрыхільна настроенага да калгаса. Узнікае драма і цікавіць яна пісьменніка сама па сабе, як **жыццё**, а не таму, што дае магчымасць праілюстраваць загадзя ўзятае палажэнне.

У Хоневым каханні да Хадоські аўтара не можа не захапіць непасрэднасць першага пачуцця, яго шчырасць. Але ж навокал узрушаны, усхваляваны свет, і адначасова з аб'яднаннем людзей ідзе размяжоўка, высвятленне розных пазіцый, і Хадоська патрабуе ад Хоні, па-першае, каб «у царкве, і што б — са свяшчэннікам», а па-другое, «і з калгаса што б—выпісаўся!» Хоня ідзе да Міканора.

«Міканор—у цемры было чутна—засоп важка, гнеўна. Гнеў не даваў яму гаварыць. — Шчэ што яна захоча?—сказаў елка. Цвёрда, нібы загадваючы, заявіў:—Ето, брат, не сакрэт, зразу ж трэба абсекці! Зразу ўсе цэпі! А то абкруціць, зацісне па руках і нагах, што варухнуцца не зможаш! Загубіць у кулацкім сваім кубле! Зразу ж—абсякай, пакамсамольску, па-бальшавіцку! Раз—і ўсё гатова! Ето—адзін выхад!..— Дак не магу... — Абсякай, раю табе, пакуль не позно! Абсякай цэпі! Не давай, штоб абкруцілі!..» І нарэшце, суровае, бескампраміснае: «Я цябе, Хартон, папярэджаю як таварыш і як парцієц...»

Выдатная сцэна! У ёй — два непаўторна жывыя чалавекі; Хоня са сваім каханнем і няздатнасцю «аб-

[Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.].

ТЭАТР НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Нядаўна гледачы Магілёва пазнаёміліся з праграмай тэатра народнай творчасці Горацкага раёна. Чым жа парадаваў ён магіляўчан?

Пахвалы заслугоўваюць змешаны хор (кіраўнік Н. Калацень), жаночы і мужчынскі ансамблі (кіраўнік В. Макеева), танцавальны калектыў (кіраўнік С. Арол). Разнастайнасць рэпертуару ў іх спалучаецца з добрым выкананнем. Тут рускія, беларускія, украінскія народныя песні, новыя песні савецкіх і замежных кампазітараў, народныя танцы.

З салістаў-вакалістаў лепш спявалі А. Пугач, А. Храмовіч, С. Махнач. Добрую тэхніку ігры на баяне прадэманстраваў выпускнік Магілёўскага музычнага вучылішча А. Папоў. Зладжана, з юнацкім запалам выканалі «Рытмічны танец» Г. Меляшэўскі і С. Воцін.

Магіляўчане чакаюць новых сустрэч з тэатрамі народнай творчасці, якія створаны ў вобласці на базе раённых дамоў культуры.

А. КУКШЫНСКІ.

Гарачая пара зараз у студэнтаў-выпускнікоў літаратурна-музычнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Хутка пачнецца іх пераддыпломная практыка ў школах рэспублікі.

На нашым здымку вы бачыце студэнтаў [злева направа] Леакадзію Доўгіль, Ірыну Фескіну, Анатоля Шыдлоўскага, якія абмяркоўваюць харавыя творы, што будуць разучаны на практыцы ў школе.

Фота П. ЛАСТАЎКІ.

ШКОЛА ЧАКАЕ МАСТАКА

Пра тое, як у нас афармляюцца школы, усім добра вядома. Загадчыку гаспадарчай часткі даюць фарбы або ён сам іх дзе-небудзь дастае і фарбуюць гэтай фарбаю, не вельмі турбуючыся, што з гэтага атрымаецца. А потым, каб не было так наўтульна, каб не «білі» ў вочы пустыя сцены, як у казарме, пафарбаваныя звычайна да палавіны маслянай фарбай ядавітага колеру, ставяць у вестыбюлях і калідорах розныя стэнды мясцовага вырабу, вешаюць плакаты, рэпрадукцыі і насценныя газеты ў самаробных рамачках.

На гэтым лічыцца, што школа афармлена і гатова прыняць вучняў. Вядома, кожны калектыў настаўнікаў хоча сваю школу зрабіць прыгожай. Вось тут і пачынаюцца ўсялякія непаразуменні. Пэўных інструкцый па гэтых пытаннях няма, спецыяльных атласаў школьных інтэр'ераў, зазірнуўшы ў якія можна было б выбраць узор па густу, — таксама няма. І дырэктар, настаўнікі, пінеражатыя робяць так, як ім здаецца лепш. І іншы раз...

Сёлета перад пачаткам навучальнага года камісія Кастрычніцкага райкома прафсаюза работнікаў асветы Мінска правярала афармленне школ. Лепшай па раёну палічылі 71-ю школу. Настаўнікі і дырэктар спрабавалі ўпрыгожыць сваю школу як мага лепш. У вестыбюлі і калідорах зашклёныя стэнды. Сам прынцып такіх стэндаў, дзе перыядычна мяняюцца матэрыялы, нядрэнны. Але матэрыялы ў іх афармлены і размешчаны безгустоўна.

Асабліва старанна ўпрыгожылі настаўніцкую. Праяўлена нямала «вынаходлівасці», клопату аб тым, каб патрэбнае знаходзілася пад рукою. Сцены настаўніцкай былі абвешаны квяцістымі планшэтамі, дыяграмамі, схемамі, скрынкамі і палічкамі. У такім пакоі не адпачнеш паміж урокамі, не папрацуеш.

Дзіву даешся, што аўтарытэтнай камісіі спадабалася іменна 71-я школа. Магчыма, гэта здарылася таму, што ў складзе камісіі не было ніводнага мастака, ніводнага спецыяліста, які разбіраецца ў пытаннях афармлення школьнага інтэр'ера.

У нашай рэспубліцы ўжо даўно вядуцца размовы пра эстэтычнае выхаванне вучняў, пра стварэнне добрых школьных інтэр'ераў. Аднак зроблена ў гэтым напрамку мала — нават у сталіцы, не гаворачы пра раённыя і сельскія школы. І справа не толькі ў тым, што школам на афармленне інтэр'ераў адпускаюць мала грошай. Бяда яшчэ і ў тым, што іншы раз гэтая вялікая і патрэбная справа залежыць ад людзей, якія не надаюць ёй асаблівага значэння, ад людзей, якім падабаецца, як гэта відаць з прыведзенага прыкладу, безгустоўшчына...

Вывад напрошваецца сам сабою. У афармленні нашых школ павінны самы актыўны ўдзел прымаць мастакі.

Яшчэ летась згодна з рашэннем праўлення Саюза мастакоў БССР былі замацаваны за школамі Мінска каля 50 мастакоў — яны павінны былі памагаць гурткам выяўленчага мастацтва, афармляць школы. Школы ведалі пра такое рашэнне, але чамусьці не спяшаліся запрашаць мастакоў. Не дачакаўшыся, калі іх запросяць, некаторыя мастакі самі пайшлі ў школы. Але аказалася, што іх там не чакаюць: гурткі па выяўленчым мастацтву амаль нідзе не арганізаваны. А што датычыць афармлення інтэр'ера, дык дырэктары вырашылі — калі за школаю замацаваны мастак, дык ён сам, сваімі рукамі, ды яшчэ сваім матэрыялам, ды яшчэ дакладна па ўказанню дырэктара павінен усё зрабіць. Такое здарылася ў 30-й школе. Туды пасылалася некалькі мастакоў, аднак агульнай мовы з дырэктарам школы яны не знайшлі. Некалькі гадоў назад школе прапанаваў свае паслугі мастак І. Эйдэльман. Ён прынёс эскізы афармлення: роспісы для актавай залы, вырашэнне вестыбюля і г. д. Ён прапаноўваў зрабіць усё на грамадскіх асновах. Эскізы насілі паказваць ва ўсе інстанцыі. Аднак яны не спадабаліся. Школу афармілі сваімі сіламі пад кіраўніцтвам настаўніка малявання. Пано і партрэты ў залах выкананы непрафесіянальна, на нізкім узроўні. Лесвічныя поручні праз кожныя паўметра бязглузда ўпрыгожылі вялізнымі кветкавымі гаршкамі з пальмамі.

А вось яшчэ адзін даволі дзіўны прыклад. Гаворка ідзе пра школу № 42. Вясною сюды з групай студэнтаў Мінскага мастацкага вучылішча прыйшоў малады мастак Ул. Гардзіенка, выпускнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Задача была нялёгкая, афармленне інтэр'ера патрэбна было арганічна ўвязаць з архітэктурай. Школа пабудавана па старым тыпавым праекце. Маладыя энтузіясты ўзяліся за справу. Паўтара месяца яны працавалі ў школе. Усё даводзілася рабіць сваімі рукамі. На вуліцы збіралі каменьчыкі і плітку для мазаікі, рабілі сталярныя работы, самі ў матэрыяле ўсё выконвалі.

У школьным вестыбюлі з'явіўся выразны рэльеф В. Р. Бялінскага (школа носіць імя вялікага крытыка), мазаіка на тэму «Навука і жыццё», стэнд пад дэвізам «Камунізм — гэта маладосць свету і яго будаваць маладым». Афармлены тэматычнымі пано лесвічныя пляцоўкі: на першым паверсе — «Піянерыя», на другім — «Камсамол», на трэцім—«Сувязь школы з жыццём». Пано дапаўняюцца ў калідорах малюнкамі на драўніна-стружачных плітах. Цікава вырашаны куток фізкультурніка і дошка аб'яў. Яшчэ не ўсе работы скончаны, школа будзе азеляніна, пасля капітальнага рамонту плануюць замяніць асвятляльную арматуру лямпамі дзённага святла, на кожным паверсе павінны з'явіцца стэнды, якія расказваюць пра школьнае жыццё.

Работы выкананы на прафесіянальным узроўні, а некаторыя, напрыклад, пано на школьную тэму ў тэхніцы металапластыку, роспіс сграфіто і інш., маюць значную цікавасць.

У школу з добрым сэрцам, з разуменнем справы прыйшоў спецыяліст-мастак. І аддача атрымалася вялікая. І вось сюды прыходзіць раённая камісія па праверцы школ і пачынае... абурацца. Мазаіка! Пано ў матэрыяле! Пано з жалезных палос! Гэта членам камісіі здалося непрывычным, дзікім, нават абстракцыяністкім.

Вырашылі праверыць на ўспрыняцце. У прысутнасці камісіі, дырэктара школы, настаўнікаў выклікалі вучня 4-га класа і спыталі: «Што гэта?» «Не ведаю», — адказаў вучань. Гэтага было дастаткова: вучань не ведае, камісія не разумее. Дырэктар М. Кляцкова разгубілася, абаранялася як магла. Але камісія вырашыла «ссекчы» рад работ.

Магчыма, у афармленні гэтай школы і ёсць недахопы. Бо работы, хоць і выкананы пад кіраўніцтвам здольнага мастака, добрага дэкаратара,— студэнцкія. Магчыма, пачынаючы грунтоўныя работы па афармленню школы, трэба лішні раз параіцца. Пры Міністэрстве асветы БССР існуе мастацкі савет па эстэтычным выхаванні, у яго ўваходзяць і мастакі, там можна атрымаць любую кансультацыю. Але ж не прафесіянальныя недахопы ўбачыла камісія ў афармленні школы, а тое, што твары зроблены чамусьці «з каменняў» і «якая можа быць прыгажосць у карціне з жалезных палос».

Такія факты выклікаюць трывогу. Вучань прыходзіць у школу дзіцем, а выходзіць дарослым чалавекам, са сфарміраваным светапоглядам, паняццямі. Дзесяць год ён праводзіць у сценах школы, і як важна, каб усё, што праходзіць перад яго вачыма, адпавядала патрабаванням высокага мастацкага густу. Тут усё павінна быць апрабавана, прадумана.

Тут не абысціся без спецыялістаў.

Мастак павінен прыйсці ў школу.

Л. МАРЫКС,
кансультант Саюза мастакоў БССР.

НЕ АБ АДНЫМ ХЛЕБЕ...

НА КАЛГАСНЫМ РАХУНКУ

Сёлета яшчэ не было той суботы і нядзелі, каб на сцэне Талачынскага раённага Дома культуры не выступалі сельскія калектывы мастацкай самадзейнасці. Тут агляд народных талентаў працягваецца круглы год. У канцы кожнага квартала аб'яўляюцца пераможцы гэтага творчага спаборніцтва—лепшы калгасны і саўгасны калектыў.

Дарэчы заўважым, што члены аглядавай камісіі вельмі патрабавальныя. Перш чым артыстам выйсці з канцэртам да гледача, калі ласка, трымай перад ім справаздачу: што зроблена за апошні час, якія планы на будучае. Пры вызначэнні пераможцаў члены журы кіруюцца не толькі прагледжанай праграмай калектыву, а бяруць пад увагу і яго творчую біяграфію.

— Калі гэтага не ўлічыць,— расказвае загадчыца раённага аддзела культуры Вера Іванаўна Пётух,—дык можа здарыцца так, што цікавы, з добрымі традыцыямі калектыў незаслужана атрымае заніжаную ацэнку. Могуць знайсціся і такія, якія будуць выступаць толькі для паказухі.

Справаздачныя канцэрты — дзейсная форма вучобы сельскіх самадзейных артыстаў. Аддзел культуры стараецца абмеркаваць кожнае выступленне аматараў самадзейнага мастацтва, падказаць, дапамагчы.

Вера Іванаўна пазнаёміла мяне з планам-графікам спаборніцтва калектываў мастацкай самадзейнасці. Мне кінулася ў вочы тое, што ў графіку адсутнічалі гурткі сельскіх клубаў, дамоў культуры і бібліятэк.

— Няўжо гэта агляд толькі калгасна-саўгаснай самадзейнасці?—пытаюся я.

— А навошта культурна-асветную работу знімаць з балансу калгасаў і саўгасаў і прыпісваць яе нашым сельскім асяродкам культуры? — заўважае Вера Іванаўна і тут жа дадае:—Мы стараемся, каб у кожнай брыгадзе калгаса і аддзяленні саўгаса быў свой клуб, бібліятэка, каб там працавалі калектывы мастацкай самадзейнасці, праводзіліся тэматычныя вечары, вечары ўшанавання перадавых людзей, наладжвалася абмеркаванне твораў мастацкай і сельскагаспадарчай літаратуры. І ўвогуле, каб уся культурна-асветная работа, якая знаходзіцца на балансе калгаса, была цікавай і змястоўнай.

Вера Іванаўна называе лічбы. Некаторыя з іх я занатоўваю ў сваю запісную кніжку. У раёне ва ўсіх брыгадах калгасаў працуюць бібліятэкі. Іх 63. Я пацікавіўся, якія клопаты праяўляюць аб іх кіраўнікі мясцовых калгасаў і раёна.

Галоўны бухгалтар калгаса «Перамога» Пётр Вікенцьевіч Вайтулянец расказвае, што сёлета праўленне ўжо выдаткавала на набыццё новых кніг каля 500 рублёў, на наглядную агітацыю і выпіску перыядычнага друку — звыш 1000 рублёў. Для кожнай брыгаднай бібліятэкі набыты тэлевізар, для гурткоў мастацкай самадзейнасці—касцюмы, тэатральны рэквізіт.

— Як бачыце,—заўважае Пётр Вікенцьевіч, — выдаткі вялікія, але яны даюць і карысць. Пра гэта лепш раскажуць самі людзі.

Да некаторых з калгаснікаў я звяртаюся з наступным пытаннем: «Як дапамагла вам у працы кніга?»

Гаворыць брыгадзір калгаса П. Заблоцкі:

— Пра бульбу я прачытаў многа літаратуры. Усё перадавое аб яе вырошчванні імкнёмся скарыстаць у сябе. Брыгада наша атрымала сёлета нядрэнны ўраджай бульбы—па 189,6 цэнтнера з гектара.

Расказвае свінар Ул. Жораў:

— Аб вопыце працы лепшых свінаводаў краіны я летась прачытаў 11 кніг і брашур. Іх аўтары — вучоныя, спецыялісты жывёлагадоўлі—дапамагаюць мне ў працы. У гэтым годзе я адкарміў і здаў дзяржаве 695 галоў свіней.

Звяннявая па льну М. Пакура:

— Члены майго звяна даўно сябруюць з кнігамі. Мы шмат чытаем пра вопыт лепшых ільнаводаў рэспублікі, пра іх працу. Пераймаем ўсё лепшае ў вырошчванні гэтай каштоўнай культуры.

Такіх прыкладаў, калі кніга стала добрым памочнікам і дарадцам у працы, можна было б прывесці нямала. І не дзіва, што пры камплектаванні кніжных фондаў брыгадных бібліятэк праўленне калгаса асаблівую ўвагу звяртае і на літаратуру аб перадавым вопыце сельскагаспадарчай вытворчасці. У першай брыгадзе калгаса «Перамога» ў бібліятэцы 5200 тамоў кніг. Імі карыстаюцца звыш 200 паляводаў, жывёлаводаў, механізатараў. Актывісты бібліятэкі праводзяць прапаганду літаратуры, шматлікія культурна-масавыя мерапрыемствы. Нядаўна тут адбыўся тэматычны вечар, прысвечаны 35-годдзю роднага калгаса. Актывісты афармілі мясцовы клуб нагляднай агітацыяй, якая расказвае аб поспехах роднай арцелі, аб яе гісторыі, выпусцілі плакаты пра перадавых людзей і ветэранаў працы. Значная работа праводзіцца і астатнімі брыгаднымі бібліятэкамі калгаса. У кожнай з іх афармлены сацыялістычныя абавязацельствы брыгады, звенняў, вядуцца графікі іх выканання. Кніжныя выстаўкі заклікаюць: «Чытайце сельскагаспадарчую літаратуру», «Гэтыя кнігі дапамогуць вам у працы» і інш.

Многія асяродкі культуры калгасаў раёна праводзяць вечары ўшанавання лепшых паляводаў, механізатараў, жывёлаводаў. Так, бібліятэка трэцяй брыгады калгаса «Гігант» сумесна са сваім клубам ушанавала працу даярак Т. Позняк, З. Гайсёнак і Н. Пажарыцкай. Перадавыя жывёлаводы расказалі аб сваёй працы, пачулі словы падзякі. Такія вечары працоўнай славы актывісты брыгаднай бібліятэкі праводзяць часта.

У трэцяй брыгадзе калгаса «Расія» загалвае бібліятэкай на грамадскіх асновах настаўніца мясцовай пачатковай школы Варвара Кузьмінічна Рэйнерт. Яна арганізавала харавы і драматычны гурткі. У час уборкі ўраджаю самадзейныя артысты часта выступалі з канцэртамі. Бібліятэка правяла такія тэматычныя вечары, як «Новыя народныя абрады», «Сям'я і рэлігія», «У чалавека павінна быць усё прыгожае», «За што змагаецца наша брыгада» і інш. А нядаўна тут быў праведзены вечар, прысвечаны перадавой калгасніцы Вользе Машкаровай.

Можна было б шмат чаго добрага сказаць і пра культурна-асветныя ўстановы калгаса імя Дзіміграва. Тут працуюць дзевяць брыгадных бібліятэк, столькі ж клубаў. І ў кожным з іх ёсць тэлевізар, настольныя гульні, музычныя інструменты, спартыўны інвентар. Для сваіх устаноў культуры калгас выпісвае больш чым на 300 рублёў часопісаў і газет.

Для каардынацыі работы вялікай сеткі калгасных, саўгасных, сельскіх і школьных бібліятэк раёна створана метадычнае аб'яднанне. У яго ўвайшлі вопытныя прапагандысты кнігі. Кожны з іх адказвае за работу трох-чатырох бібліятэк. Члены метадычнага аб'яднання сёлета зрабілі звыш 70 выездаў на вёску, дзе дапамагалі наладжваць правільны ўлік і расстаноўку кніжнага фонду, афармляць наглядную агітацыю, праводзіць літаратурныя вечары і канферэнцыі чытачоў.

Раённая бібліятэка адзін са сваіх пакояў аддала пад метадычны кабінет прапагандыстаў кнігі. Тут сабрана літаратура аб перадавым вопыце лепшых бібліятэк, кнігі і брашуры аб прапагандзе грамадска-палітычнай, мастацкай, сельскагаспадарчай літаратуры, бібліятэчныя плакаты, інфармацыйныя бюлетэні, даведнікі.

З сельскімі прапагандыстамі кнігі аддзел культуры і раённая бібліятэка праводзяць метадычныя заняткі, семінары. Да кожнага з іх рыхтуюцца паказальныя масавыя мерапрыемствы, стэнды, плакаты, літаратурныя выстаўкі, рэкамендацыйныя спісы.

Для прапаганды сельскагаспадарчай літаратуры выкарыстоўваецца і мясцовае радыёвяшчанне. «Хімія-цудадзейка», «Хімія—сельскай гаспадарцы», «Для цябе, паляводзе», «Навінкі сельскагаспадарчай літаратуры»—вось далёка не поўны пералік бібліяграфічных аглядаў, прысвечаных прапагандзе рашэнняў сакавіцкага Пленума ЦК КПСС, які за апошні час начулі радыёслухачы.

Пытанне аб рабоце калгасных і саўгасных бібліятэк, клубаў і чырвоных куткоў разглядалася на сумесным пасяджэнні райкома партыі і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных. Гэтым летам пленум райкома партыі абмяркаваў пытанне і аб тым, як палепшыць работу па камуністычнаму выхаванню сельскай моладзі. Тут ішла гаворка аб формах і метадах работы сельскіх і калгасных асяродкаў культуры.

У калгасных клубаў і бібліятэк Талачынскага раёна ёсць чаму павучыцца. І не выпадкова, што ўлетку тэтага года іменна тут быў праведзен рэспубліканскі семінар бібліятэчных работнікаў. Удзельнікі семінара пераканаліся, што культурна-асветную работу паспяхова могуць весці самі ж калгасы. А яшчэ ж бывае, што той ці іншы аддзел культуры, каб паказаць «вал» сваёй работы, свядома прысвойвае ўсе калектывы мастацкай самадзейнасці і спартыўныя секцыі калгасаў. І не дзіва, што многія праўленні сельгасарцелей з асцярогаю ставяцца да выдаткавання сваіх культфондаў.

— А навошта нам,—разважаюць яны,—траціць грошы на работу самадзейных артыстаў сельскага клуба? Гэта ж калектыў дзяржаўнай установы культуры.

Вядома, так не стануць разважаць кіраўнікі калгасаў імя Леніна, «Перамога», «Праўда», імя Дзіміграва, «Расія», імя Валадарскага і многіх іншых гаспадарак Талачынскага раёна, якія дбаюць пра свае асяродкі культуры, пра самадзейных артыстаў. Культурна-асветная работа тут стаіць побач з клопатамі аб вырошчванні высокіх ураджаяў.

А. МАХНАЧ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

СВАЯ «ТРАЦЦЯКОЎКА»

Настаўнікі і школьнікі Смятаніцкай сярэдняй школы стварылі пры школе карцінную галерэю. У прасторнай і светлай зале выстаўлены шматлікія рэпрадукцыі карцін, якія экспануюцца ў Траццякоўскай галерэі. Сярод іх—рэпрадукцыі работ выдатных рускіх мастакоў І. Рэпіна, В. Сурыкава, І. Левітана, М. Васняцова, А. Венецыянава. З твораў савецкіх мастакоў вялікае месца ў школьнай галерэі займаюць лепшыя работы І. Бродскага, М. Грэкава і іншых жывапісцаў.

Многія з рэпрадукцый карцін школьнай «Траццякоўкі» часта выкарыстоўваюцца на ўроках літаратуры і малявання. Галерэю рэгулярна наведваюць жыхары вёскі Смятанічы і іншых населеных пунктаў.

МУЗЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫ

Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла ў Магілёве і Быхаве вечары фартэпіннай і вакальнай музыкі з удзелам народнага артыста Беларускай ССР В. Чарнабаева і піяніста А. Янчанкі. Праграму канцэртаў склалі творы І. Баха, І. Брамса Д. Шастаковіча, А. Янчанкі, арыі з опер і рамансы А. Даргамыжскага, А. Сярова, М. Мусаргскага, Ш. Гуно, Дж. Расіні, Дзм. Кабалеўскага, Н. Сакалоўскага, Ц. Хрэннікава, беларускія і рускія песні.

В. Чарнабаеў сустрэўся таксама з працаўнікамі саўгаса «Вароніна» Быхаўскага раёна.

КАРЫСНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Днямі ў БДУ імя Леніна адбылася сустрэча студэнтаў аддзялення журналістыкі з пісьменнікамі А. Кулакоўскім, І. Дуброўскім, Ул. Юрэвічам. Пісьменнікі падзяліліся сваімі творчымі планамі, расказалі пра тое, як працуюць над творамі пра нашых сучаснікаў.

В. МЫСЛІВЕЦ.

Песні па-над Ясельдай

За нетаропкай Ясельдай-ракой — бяскрайнія заліўныя лугі. А па берагах яе раскідала свае хаты невялікая палеская вёска Парэчча. Кожны пакажа тут дом Георгія Уладзіміравіча Шпакоўскага, кожны вясковец можа шмат цікавага расказаць пра яго. Настаўнік, музыкант, мастак — усё для людзей.

— Вось прыгадваю такога хлапчука — Сцяпана Водчыца, — гаворыць Георгій Уладзіміравіч. — Вельмі любіў маляваць. Цяпер ён студэнт Маскоўскага мастацкага вучылішча...

Гэта адзін з вучняў Шпакоўскага. А іх у яго — амаль уся вёска. Хто ў школе вучыцца, хто ў хоры пад яго кіраўніцтвам спявае, каго іграць на баяне або гітары вучыў. Не шкадуе ён ні часу свайго, ні сіл.

Семнаццацігадовым юнаком, у 1938 годзе, прыехаў Георгій Шпакоўскі ў Парэчча. І адразу тут у яго паявіліся сябры. Як даведаліся, што ведае ён савецкія песні, дык пачалі ўпотай збірацца ў Георгія і спяваць — «Кацюшу», «Тры танкісты»... А калі прыйшло жаданае вызваленне, у Парэччы быў ужо даволі вялікі і зладжаны хор з багатым рэпертуарам. Ужо праз некалькі дзён хор выступіў з канцэртамі перад аднавяскоўцамі і жыхарамі суседніх вёсак.

Тады і паверыў у свае сілы малады хормайстар, і вось ужо 25 гадоў не расстаецца ён з любімай справай.

З тае даваеннай пары захавалася ў Георгія Уладзіміравіча не толькі ганаровая грамата за поспехі яго хору. Ёсць яшчэ адзін цікавы і хвалюючы дакумент — у 1939 годзе жыхары вёскі на сваім агульным сходзе аднадушна абралі яго народным настаўнікам. Гэта быў вялікі гонар, і хлопец разумеў, якая гэта адказная і пачэсная справа — вучыць людзей. Ён выкладаў тады нямецкую мову, спевы і маляванне. Ужо пасля вайны скончыў Георгій Уладзіміравіч завочна Маскоўскае музычнае вучылішча.

Георгій Уладзіміравіч не толькі кіруе хорам. З апошняга агляду прывёз ен дыплом за выкананне ім песні «Люблю цябе, мой любы край». Між іншым, гэта быў пяцідзесяты дыплом сям'і Шпакоўскіх. На некаторых з іх стаяць імёны яго дачкі Галіны і сына Георгія. Дарэчы, заняткі з бацькам былі першым крокам Галіны на шляху музычнай адукацыі. Скончыўшы Маладзечанскае музвучылішча, яна стала студэнткай Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

У школьнай студыі выяўленчага мастацтва, якой кіруе Георгій Уладзіміравіч, крок за крокам вучацца дзеці не толькі маляваць, але бачыць і разумець прыгожае. Члены студыі самі абсталявалі сваю «малую траццякоўку».

Георгій Уладзіміравіч паспявае ўсюды — у клубе арганізоўвае музычныя вечары, як дэпутат сельсавета ўзначальвае культурна-бытавую камісію. Шмат намагаўся прыклаў ён, каб у кожнай вёсцы калгаса быў свой клуб і бібліятэка, а на кожнай калгаснай ферме — чырвоны куток.

Народны настаўнік... Не толькі ўрокамі ў школе апраўдвае гэтае званне Георгій Уладзіміравіч Шпакоўскі.

С. ШАПІРА.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ ПРЭМ'ЕРЫ

У Гомельскім абласным рускім драматычным тэатры адбылася прэм'ера спектакля «Дзеці Ванюшына» па п'есе С. Найдёнава. Пастаноўку ажыццявіў Ю. Арыянскі, рэжысёр Ф. Шчарбакова. Дэкарацыі створаны мастаком В. Грышыным. Спектакль цёпла прыняты гледачом.

На здымку—сцэна са спектакля.

У ролі Іны—арт. І. Бандарэнка, Канстанціна—арт. В. Слаўкоў.

Фота Ул. ТКАЧЭНКІ.

ЧАС ІДЗЕ, РАМАН РАЗГОРТВАЕЦЦА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

сякаць цэпі» і Міканор, крыху, не сакрэт, грубавата-прасталінейны, але таксама шчыры ў сваім парыве дапамагчы паплечніку і дружбаку, зберагчы для калгаса, для камсамола добрага хлопца, якога «абкручваюць».

Хоня не паслухаўся Міканора — паміж ім і калгасам стала каханне...

А вось Ганну Чарнушку, жонку-батрачку ўчэпістага, ненажэрнага кулака Яўхіма Глушака, яе духоўная і фізічная заняволенасць, яе «назалелае адчуванне заблытанасці жыцця» і, нарэшце, яе «злачынная» і неперадольнае каханне да жанатага ўжо Васіля ўсё больш і больш набліжаюць да калгаса. Не, нават не да калгаса як да ясна ўсвядомленай мэты, а да самога перавароту і ломкі старога, ненавіснага, глушакоўскага, усяго, што скажае натуральныя імкненні чалавека, робіць яго несвабодным у сваіх дачыненнях да іншых людзей.

«— Перайначваць усё страшно...— разважна прамовіла Ганна. — Да й тое, праўда, няведама, як там будзе. А толькі горай, як е, наўрад ці будзе. Горай, здаецца, не бувае...» Гэта яшчэ не голас свядомага выбару, — гэта голас трывогі, тугі, інстынктыўнага нежадання жыць па-старому.

І калі мы, чытаючы першую частку хронікі, адчувалі: не, не «сцерпіцца» непакорлівай па натуры, наўрымслівай Ганне Чарнушка, не паўторыцца ў статысячным варыянце трагічная доля жонкі-наймічкі, то раман «Подых навальніцы» паказвае ўжо Ганну ў актыўным, непрымірымым бунце супроць Глушакоў — яна кідае іх дом, іх палон, падаецца ў школу, да малазнаёмай настаўніцы ў Глінішчах...

Ганна — адзін з асноўных вобразаў рамана. У ім праявілася каштоўнае ўмельства Мележа раскрываць чалавечы характар ва ўсёй безупынасці, непадказанасці яго ўнутранага самаразгортвання і самаразвіцця. Пра што б ні думала, ні разважала Ганна, што б ні рабіла, у якіх перыпетыях ні апынулася б, яна заўсёды застаецца сама сабой, чалавекам праўдзіва і поўна акрэсленага характару, лёсу, душэўнага ладу.

Хіба за выключэннем аднаго эпізоду, там, дзе, вярнуўшыся дахаты пасля кіно-баявіка аб каўказскіх абрэках, Ганна думае пра сваё: «Душа балела па адважным конніку, марыла аб нейкіх адважных учынках, аб прасторы, аб волі. Пазяцела б, не паглядзела б ні на што — каб было з кім...»

Піхалагічная прыдумка: вось так — рамантычна, прыгожа, адштурхоўваючыся ад цалкам чужога і незразумелага, — Ганна наўрад ці думала.

Затое ўсё праўда і ўсё пераконвае там, дзе Ганна хоча разабрацца, адшукаць нейкі разумны сэнс у Васілёвых паводзінах («Не, не перадумаў. Ето так здалося толькі... Ето ён толькі перад людзьмі так... Каб не пялі лішняга...»); і там, дзе, прычуваючы да яе «багацця» і «шчасця» ў Глушакоў: і там, дзе вырашае бязлітасна рвань з гэтым «багаццем», што цяжкім каменем вісіць на шыі... Завершаны, цэльны чалавечы характар!

Арганічна, з уласных, як кажуць, патэнцый, без зрываў у чужое, яму не ўласцівае, не здраджваючы таму, што закладзена ў асновах натуры, развіваецца ў новай кнізе Мележа і вобраз галоўнага героя папярэдняй кнігі — вобраз Васіля Дзятла, які і тут, у «Подыху навальніцы», займае адно з цэнтральных месц.

Помніцца, калі з'явіліся ў друку «Людзі на балоце», адзін крытык папракнуў пісьменніка за тое, што ён быццам «перагусціў, адмоўнае» ў Васілю, залішне ўскладніў яго шлях да новага, да калгаснага. Наадварот, другі крытык паспешліва залічыў хлопца ў «змагары за сваё і агульнае шчасце» на той падставе, што Васіль самавольна заараў кавалак чужога, кулацкага, надзелу. Думаю, што абодва крытыкі памыліліся.

Ніякі ён не змагар, Васіль, тым больш за «агульнае шчасце». У тым, як ён схапіўся з Яўхімам на жаданым, высненым у марах кавалку зямлі каля цагельні, выявіўся не змагар за грамадскія інтарэсы, а тыповы ўласнік, хоць і бядняк, чалавек, які ніколі не меў інакшай мэты, як толькі ўзбіцца на сваю зямлю, на сваю гаспадарку. Такім мы бачым Васіля і на старонках рамана «Подых навальніцы».

Што да папрокаў у тым, быццам Мележ «цягне» з «другім нараджэннем» свайго героя, што ён ніяк не збярэцца паставіць яго на новы шлях, то, думаецца, тут дае аб сабе знаць адна даволі распаўсюджаная— і дагматычная па самай сутнасці — крытычная ўстаноўка, згодна з якой галоўная ідэя твора павінна быць у яе «чыстым» выглядзе ўвасоблена ў галоўным персанажы. Звернутая да Мележа, гэта ўстаноўка гучыць прыкладна так: калі ты маеш сваёй задачай паказаць перамогу калгаснага ладу, яго няўхільны рост, то давай не марудзь з героем, не дазваляй яму вагацца далей, чым да палавіны твора, інакш мы скажам, што ты няправільна выбраў героя...

А Васіль вагаецца. Вагаецца на працягу ўсёй кнігі, роспачна думае, прыглядаецца, вырашае, як бы ў тумане «гарачай няцямнасці».

«У паспакайнелую галаву раптам увайшло: А мо і праўда — пайсці? Забраць Ганну — і пайсці: «Прымі-ці... Як так ірвацца!..» Ен пабачыў сябе з Ганнаю ўжо ў калгасе, пабачыў з ціхай радасцю і палёгкай. Але пазней, калі пачаў цвяроза абдумваць усё, на змену лёгкасці зноў прыйшла блытанасць пачуццяў, развал: пайсці, кінуць усё, што нажываў гадамі! Улезці самому ў гэтую выдумку, якая можа аказацца пасткаю, пелькаю! У пельку ўлезці, толькі што — удваіх з Ганнаю!..»

Зямля, Ганна... Ганна, зямля... Адно моцна трымае ў сваім палоне, не выпускае, бо «ўся сіла чалавека — ў зямлі. І сіла ўся, і радасць! Няма зямлі — няма, лічы, і чалавека!» Другое штурхае туды, дзе ўсё ірвецца, кранаецца з месца, развязвае старыя вузлы, дзе ўсё пачынаецца нанава. Што возьме верх у Васілёвай душы?

Аўтар не спяшаецца з адказам, не «падганяе» ён і героя. Бо аўтару, відаць, важна паказаць такі паварот у лёсе героя, калі «знешнія» яго ўчынкі, лінія яго практычных паводзін будуць надзейна падтрыманы і абгрунтаваны ўнутраным, маральным паваротам у свядомасці, у сферы пачуццяў і думак.

Пісьменнік разумее, як мне здаецца, і другое: людзі, падобныя да Васіля, маюць сур'ёзныя абавязкі перад новым, перадавым, але, каб гэта новае трывала ўвайшло ў быт мілёнаў, авалодала іх сэрцамі, яно павінна, не адступаючы ад сваіх прынцыпаў, з найбольшай чуласцю паставіцца да кожнага «маленькага» чалавека, цярпліва, па-ленінску вучыць яго самім вопытам будаўніцтва справядлівага жыцця.

Вядома, будучыня Васіля будзе галоўным чынам залежаць ад таго, ці адолее ў яго душы бядняк-працаўнік уласніка-індывідуаліста. Аднак ужо тады, у той час, пра які расказвае Мележ, было надзвычай важна ўбачыць і захаваць для будучыні, для калгаса, скажам, такую рысу Васілёва ўласніцтва, як паэтычнасць адносін да працы, да зямлі, павага да ўсяго, што робяць і могуць зрабіць дбайныя чалавечыя рукі.

Штосьці не верыцца, каб хто з Глушакоў, азіраючы нават сваё поле, мог сказаць аб сабе так, як гаворыць Васіль: «...кожную сяблінку, здаецца, сагрэў бы сам! Ішоў бы ад адной да другой ды хукаў бы, каб не мерзла!» І не будзем таіць граха, боль Васіля робіцца і нашым болем, калі мы чытаем, як ён, вяртаючыся з Юравіч, у поемках «звыкла збочыў з дарогі — зірнуць на сваю рунь. Яшчэ не дайшоўшы, разглядзеў: сумеўся: рунь чарнела нейкімі пачварнымі камякамі. Ен. устрывожаны, падбег і знячацку ўпаў на калені: рунь была паарана!..»

Гэта Міканор, гарачая галава, так загадаў, каб правучыць неслуха. А мы, увогуле сімпатызуючы Міканору (бескарыслівы, непадкупны рыцар

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

ПАДПІСКА ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ

12 кастрычніка г. г. у газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны артыкул «Горш, чым абыякавасць», у якім гаварылася, што некаторыя ўстановы культуры і школьныя бібліятэкі Вілейскага раёна не выпісалі на 1966 год многіх рэспубліканскіх літаратурна-мастацкіх выданняў.

Сакратар Вілейскага райкома партыі Ул. Кляшняк паведаміў рэдакцыі, што «артыкул быў абмеркаваны ў аддзеле прапаганды і агітацыі РК КПБ. Некаторыя факты, пададзеныя ў артыкуле, мелі месца. Не ўсе клубы, сельскія і школьныя бібліятэкі выпісалі часопісы «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», газету «Літаратура і мастацтва».

Раённы аддзел культуры і райана прынялі меры, каб павялічыць бюджэтную і індывідуальную падпіску на літаратурна-мастацкія выданні».

Разам з тым, у артыкуле была дапушчана недакладнасць. Тав. Ул. Кляшняк адзначае, што сцвярджэнне «аўтара артыкула М. Палуніча аб тым, што ўсе рэспубліканскія літаратурна-мастацкія часопісы і газета «Літаратура і мастацтва» з рэкамендацыйнага спісу былі выкрэслены, не адпавядае сапраўднасці. Загадчык аддзела культуры тав. Бальнэўскі падкрэсліў (а не выкрасліў) у спісе выданні, якія пажадана выпісаць у сельскім клубе, у тым ліку «Правду», «

Паэтычная паверка

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

ЧАЙКА

Памяці маёй маці

Кружыцца чайка над лугам,
Кліча сваіх чаянят.
Хмары нахлынулі цугам,
Чайку адносяць назад.

Ліўнем халодным нябёсы
Долу прымялі кусты.
Вецер раз'юшаны, злосны
З дрэваў зрывае лісты.

Бура не ў час загуляла,
Стогне, сваволіць наўкруг.
Чайка з-пад хмары упала,
Крыламі б'ецца аб луг.

Дзе чаняткі паселі
Ў хілай траве між дарог?
Белых рамонкаў мяцеллю
Ўсыпан зялёны мурог.

Градам пабітыя краскі,
Ліўнем прымята трава.
Чайкіна сэрца на часткі
Хоча віхор разарваць.

Хочуць маленькую хатку
Жвірам занесці вятры,
Там, дзе раслі чаняткі,
Росы пілі на зары.

Чайцы нічога не трэба,—
Толькі б прабіцца праз град —
Зноў узнімаецца ў неба,
Кліча сваіх чаянят.

НЕРЫНГА

На Курскай выгнутай касе
Стаю прад Балтыкай сівою.
А дрэвы стромкія ў расе
Шумяць пад хмарамі ліствою.

Прыбой выплёсквае пяскі,
Да самых хмар узносіць дзюны.
Па-над касой шумяць вякі
Сям'ёю дрэў — старых і юных.

Ці лістапад, ці сіні май —
Яна гамоніць ля прычала.
Таму, напэўна, гэты край,
Літва, ты Нерынгай назвала.

Я плыў да гэтае касы
Праз дзве краіны,
Шлях няблізкі.
І Нёман-бацька
Шум лясны
У мора выплеснуў з калыскі.

На схілы дзюн, на ўскрай Літвы
Узнесла хваля нас марская.
Я чую ціхі шум ліствы,
Што ў мора росы асыпае.

Мне добра тут між дзюн сівых:
Нібы здалёку да Айчыны,
Як птах, лячу з краёў другіх
І тут раблю свой адпачынак.

Грымяць няспынна хвалі вод,
Аб камні б'юцца з новай сілай.
А сосны хіляцца на ўсход,
Да той зямлі, што іх расціла.

ЯНТАР

Над пасёлкам Янтарным
Занялася зара.
Неба стала бясхмарным,
Бы само з янтара.

Ззяюць барвамі далі
Ад рабін каля хат,
Ад янтарных караляў
На грудзях у дзяўчат.

Выйдзі, любая, з хаты
На вячэрняй зары.
Свой янтар мне, салдату,
На ўспамін падары.

Будзе мора ўсміхацца,
А янтар — зіхацець
Там, дзе зоры іскрацца,
Як асення медзь.

Успыхне зоркаю алай
Твой янтар над сялом.
Ты ж яго сагравала
Свайго сэрца цяплом.

Гэтак спрытна і дбайна
Час яго абчасаў,
І з жывіцы звычайнай
Ён каменьчыкам стаў.

Ты ідзеш з ім праз восень
У дзявочай гурбе.
Быццам свет прыгажосцю
Адарае цябе.

Льюцца ў сэрца ўладарна
Іскры чорных вачэй.
Ад крупінкі янтарнай
Стала ў свеце святлей.

І. Фяцісаў працуе...

У майстэрнях мастакоў

ПРАЦУ І ТАЛЕНТ—ЛЮДЗЯМ

...Масіўная мэбля кабінета. У яе быццам урос пыхлівы чалавечак—ён тут начальнік, «гаспадар». Перад ім старая жанчына — відаць, не ўпершыню яна прыходзіць з просьбаю ў гэты пакой, дзе ад усяго павявае холадам, раўнадушнасцю. З-за прыадчыненых дзвярэй нясмела выглядае сакратарка. У яе паглядзе—спачуванне наведвальніцы. Каму, як не ёй, добра ведаць звыклую фразу «гаспадара»: «Зайдзіце заўтра!»

Карціна так і называецца — «Зайдзіце заўтра!» Яна экспанавалася на многіх выстаўках, карысталася папулярнасцю. Яе аўтар—брэсцкі мастак Іван Якаўлевіч Фяцісаў. Ён пастаянна імкнецца ў сваіх творах як мага больш дасканала перадаць самую істотную сутнасць сваіх персанажаў.

Усё яго творчае жыццё звязана з Брэстам. У 1946 годзе, пасля службы ў арміі і вучобы ў іванаўскім мастацкім вучылішчы, ён апынуўся ў паўразбураным горадзе на заходняй граніцы. Працаваў на вакзале, пісаў афішы, шыльды. Пазнаёміўся з мастакамі Мікалаем Чураба і Іванам Рудчыкам. Сур'ёзна задумаўся пра творчасць. Разам з Чураба стаў весці занятні па жывапісу ў арганізаванай імі студыі выяўленчага мастацтва пры абласным Доме народнай творчасці. Пасля выкладаў маляванне ў педвучылішчы.

— Вось цяпер езджу па раёнах,—кажа Іван Якаўлевіч,—і часта сустракаю сваіх былых вучняў. Усе яны настаўнікі, вучаць дзяцей маляваць.

Працаваў Фяцісаў заўсёды многа: рабіў замалёўкі, пісаў пейзажы, пачаў спрабаваць сілы ў жанравым жывапісе. Невялікі эцюд «Стары дворык» паказаў, што ў маладога мастака немалы талент. Гэта было яшчэ ў 1947 годзе. А праз два гады Фяцісаў быў прыняты ў члены Саюза мастакоў БССР.

Шырокае прызнанне атрымалі працоўнікі музея не мелі дастатковага вопыту. Давялося яму з галавою ўвайсці ў гістарычную літаратуру, вышукваць дакументы, звязвацца з архівам, каб крок за крокам узнавіць наглядна цэлыя перыяды, пачынаючы з часоў Картэзіянскага манастыра і першага ўпамінання пра Бярозу.

Затым пачаліся пошукі формы размяшчэння матэрыялу, якая давала б магчымасць наведвальнікам музея не толькі адразу ўбачыць галоўнае, але і эмацыянальна ўспрымаць прадстаўленае на стэндах. Нараджаліся розныя думкі, узнікалі дзесяткі разнастайных варыянтаў. Нарэшце, усё знайшло выяўленне ў мантажных лістах, у якіх аўтар канчаткова выказаў сваю задуму. Кожны дакумент, кожны прадмет экспазіцыі атрымаў сваё канкрэтнае месца. Давялося ўзяцца і за вялікія кампазіцыі. Работы «1905 год», «Становішча сялян у дваццатыя гады», «Усе на польскі фронт!» атрымалі экспазіцыю, сталі яе своеасаблівым эмацыянальным камертонам. Наведвальнікі музея не могуць застацца раўнадушнымі, напрыклад, перад адлюстраваннем дынамічнай сцэны расстрэлу дэманстрацыі ў гады пасляваеннай.

— Мне здаецца, я шмат чаго прыдбаў за паўтары гады работы над кампазіцыяй і як чалавек, і як мастак,—кажа Іван Якаўлевіч.

Наўрад ці варта даказваць, што зробленае Фяцісавым для музея—гэта таксама творчасць у самым высокім значэнні слова.

— Сядзець у майстэрні і пісаць карціны — мала, — пераканана сцвярджае Фяцісаў.—Трэба « выходзіць на свежае паветра, ісці да людзей, аддаваць ім усё, на што ты здольны...

І людзі адказваюць мастаку прызнаннем, павагай, любоўю. З якой цеплынёй гавораць пра мастака ў калектыве Жабінкаўскай школы-інтэрната, памяшканне якой афармлена Фяцісавым.

Задум у Фяцісава многа. Перш за ўсё, трэба скончыць распрацоўку праектаў экспазіцый Пінскага і Баранавіцкага музеяў. Значыць, ізноў неабходна звяртацца да літаратуры, вывучаць дакументы, гаварыць з людзьмі, спрачацца... Ды і пэндзалі не павінны засыхаць. Да 50-годдзя Савецкай улады мастак задумаў некалькі кампазіцый. Якіх? Пра гэта мастак пакуль што змоўчвае. Але новыя палотны будуць абавязкова.

Іван Якаўлевіч Фяцісаў добра разумее, што кожны новы дзень мастака—гэта вялікая і напружаная праца.

Мікалай РЫБАКОЎ.

Брэст.

Агністы, вясёлы, як само юнацтва, танец... А выконваюць яго самадзейныя артысты народнага ансамбля танца «Лянок» Мінскага трактарнага завода. І як заўсёды, іх узнач гароджаюць гледачы гарачымі воплескамі.

Фота Ул. КРУКА.

ЗАДАВОЛЕНЫ І СЛУХАЧЫ, І ВЫКАНАЎЦЫ

Адразу скажам, раўнадушных на гэтым канцэрце не было. Малады запал і натхненне выканаўцаў на эстрадзе перадаваліся слухачам, выклікаючы ў іх захапленне, што ў сваю чаргу выкрэсвала новыя іскры выканаўчага энтузіязму. У такім «узаемаразуменні» праходзіла днямі выступленне двух самадзейных калектываў Мінскай абласной народнай філармоніі.

...Гучыць адзін з новых твораў беларускай музыкі—«Палеская сюіта» Я. Глебава. Мы чуем срабрыстыя гукі цымбалаў, магутныя ўступы баянаў, аксамітнае гучанне домраў, дакладную рытмічную ігру балалаек, якіх падтрымліваюць літаўры і бубны. І здаецца, быццам кампазітар напісаў гэты твор не для сімфанічнага, а для народнага аркестра, — такое арганічнае тут гучанне народных інструментаў, якія раскрываюць вобразы «Палескай сюіты».

Музыканты - выканаўцы народнага аркестра знаходзяць яркія фарбы для перадачы настрояў у рамансе Шастаковіча з кінафільма «Авадзень». Гэтыя музыканты—студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Яны дэманструюць вынікі руплівай творчай працы пад кіраўніцтвам М. Лісіцына, які ўжо дзесяць гадоў кіруе народным аркестрам ва універсітэце.

Самадзейны калектыў выконвае класічную музыку, творы савецкіх, у тым ліку беларускіх, кампазітараў, апрацоўкі народных мелодый. У ім выраслі такія здольныя музыканты, як дамрысты Я. Басаў і С. Дылян, баяніст А. Лапкевіч, цымбалістка Э. Лосева і рад іншых маладых выканаўцаў, якія ўвесь вольны ад вучобы час аддаюць музыцы.

Слухачы горача апладзіравалі на канцэрце майстрам мастацтва рэспублікі Т. Ніжнікавай і А. Саўчанку, якія ў суправаджэнні студэнцкага аркестра выканалі некалькі вакальных нумароў. Гэтае каштоўнае пачынанне ў рабоце Народнай філармоніі, калі разам з аматарамі выступаюць артысты-прафесіяналы, варта, безумоўна, працягваць.

Якія хочацца выказаць пажаданні калектыву аркестра? Мне здаецца, неабходна больш увагі ўдзяліць ансамблю як унутры аркестра (паміж асобнымі інструментальнымі групамі), так і пры акампанемендце салістам. Больш рэльефна трэба выкарыстаць цымбалы, увесці ў партытуру аркестра балалайкі-прымы і домру-пікала, а таксама папоўніць групы ўдарных інструментаў. Выступленне аркестра мне здалося трохі расцягнутым. Магчыма трэба зменшыць колькасць акампанементаў і сканцэнтраваць увагу на якасці выканання аркестравых нумароў.

Студэнтаў змяняюць будаўнікі. Народны хор будтрэста № 5 даўно вядомы сталічнаму гледачу як цікавы выканаўчы калектыў. На жаль, змена кіраўніцтва не магла не адбіцца адмоўна на яго творчым стане. Праўда, цяпер хор паступова зноў набывае ранейшыя добрыя мастацкія якасці. Кіруе ім Станіслаў Дробыш—энергічны малады хормайстар, які вельмі любіць сваю справу.

Шырыня гучання, інтанацыйная ўстойлівасць, кантрастная нюансіроўка—усё гэта прыкметнае ў творчым калектыве, і мы спадзяёмся, што ў далейшай сваёй рабоце хор узнімецца да новага выканаўчага ўзроўню. Зладжана прагучалі песні А. Граса «Палескія прасторы» і руская народная—«Уцёс», дзе салістам выступаў А. Нячыпаровіч, які валодае голасам прыгожага тэмбру.

Крыўдна, што ў рэпертуары хору зусім няма песень, якія ўслаўляюць высакародную працу будаўнікоў. Тут кіраўніку неабходна мець больш цесны кантакт з нашымі паэтамі і кампазітарамі або паспрабаваць стварыць сваю творчую групу, і тады песні нараджаліся б у самім калектыве, як гэта было раней.

Сярод салістаў хочацца вылучыць Н. Каваленка, якая ўдала, з настроем выканала рад рускіх народных песень сола і ў ансамблі са сваімі сяброўкамі В. Юшкевіч і І. Жарковіч. Карэктна акампаніравала хору трыо баяністаў, лепшаму з іх—В. Фраловy давялося суправаджаць увесь канцэрт, з чым ён паспяхова справіўся. Аднак кіраўніцтву хору трэба паклапаціцца аб арганізацыі невялікага ансамбля народных інструментаў для суправаджэння песень і танцаў. Гэта, безумоўна, надасць гучанню хору новыя фарбы, а танцы атрымаюць цікавы акампанемент.

Увогуле, што датычыць танцавальнай групы, то яна, маючы ў сваім складзе здольную моладзь, можа разлічваць на больш актыўны ўдзел у канцэртнай праграме. Патрэбны танцы беларускія, танцы, якія адлюстроўвалі б працу і жыццё нашых будаўнікоў.

Такія канцэрты народнай філармоніі прыносяць глыбокае задавальненне слухачам і, відаць, не меншае—самім артыстам-аматарам, выклікаючы ў іх прыліў новых творчых сіл.

Г. ЖЫХАРАЎ,
загадчык кафедры народных інструментаў Белдзяржкансерваторыі.

НАШ СУЧАСНІК

ЗВЫЧАЙНЫ ЛЁС

ДАЎНО ўжо ў блакноце ў мяне запісана яе прозвішча...

Чуў, як у абласным упраўленні культуры аднаму дырэктару музычнай школы гаварылі:

— З'ездзіў бы да Максімавай павучыцца...

У Мазыры, калі гаворка зайшла пра універсітэт культуры, пахваліліся сціпла:

— Ёсць у нас і музычны факультэт. Марыя Мікалаеўна—дэкан з дня заснавання...

Гаварылі пра гарадскі хор—яму сёлета споўнілася дваццаць гадоў:

— Схадзіце да Максімавай... Ветэран...

МАРЫЯ Мікалаеўна Максімава жыве ў Мазыры васемнаццаць гадоў—пасля сканчэння музычнага вучылішча накіравалі яе сюды працаваць у музычную школу. Адразу дырэктарам. З таго часу, не ў прыклад іншым гарадам, пытанне аб дырэктары ні разу не стаяла на парадку дня і не выклікала ні ў кога ніякіх сумненняў.

Быў я ў Марыі Мікалаеўны. Падрабязна і, здаецца, шчыра пагаварылі пра школьныя справы, пра вучняў і педагогаў, пра універсітэт і гарадскую мастацкую самадзейнасць. А калі гаворка зайшла пра яе, раптам паглядзела на гадзіннік і ўстала з крэсла:

— Выбачайце, гарком партыі даручыў мне пабываць у адной партарганізацыі...

Што ж, біяграфію яе я ведаў ужо—не па анкетах, а ад людзей, з якімі кожны дзень яна сустракаецца.

І вось засталося ў мяне ў блакноце яе прозвішча, засталося жаданне расказаць пра яе. Камуніст, кіраўнік, маці чацвярых дзяцей... Пасады адказныя і турботныя. І не заўсёды дарога па жыццю дываном сцелецца—клопаты і трывогі не толькі і не столькі за сябе. А яна яшчэ—памятаеце—універсітэт, хор... Усюды паспявае—прывыклі да гэтага, не здзіўляецца ніхто.

Гаворка, увогуле, не пра подзвіг. Пра будні, пра жыццё...

Уладарнага, начальніцкага ў Марыі Мікалаеўны пры першай сустрэчы не прыкмеціш, хоць магла яна, вядома, за васемнаццаць гадоў дырэктарства выпрацаваць у сябе і знешнія і ўнутраныя праявы гэтых якасцей. Іншаму дастаткова для гэтага куды менш.

Ветлівая і ўважлівая—заходзяць у кабінет педагогі, вучні,—кожнага да канца выслухае, трошкі падумаўшы, не адкладваючы на потым, прымае рашэнне; заклапочаная—сёння на гэта ёсць асаблівая прычына. Прабачце, Марыя Мікалаеўна, я ўсё-такі раскажу.

Хтосьці пусціў па школе чутку, быццам завуч, карыстаючыся сваёй уладаю, узяла сабе звыш дазволенага вучняў. Каб фінансісты не заўважылі, не прычапіліся—запісала іх на іншага педагога, але займаецца з гэтымі вучнямі, маўляў, сама, і грошы, вядома, атрымлівае таксама сама. У школе—па завуголлях—размовы...

А Марыя Мікалаеўна ў завучы ўпэўнена—не першы год разам працуюць. Ведае, верыць яна, што не магла Яўгенія Сямёнаўна лайсці на падлог. Больш таго, усім вядома, што завуч вядзе некалькі вучняў на грамадскіх асновах—вось і добрую справу паклёпнік можа так перавярнуць, што белае здасца чорным. Можна было б дырэктару і не надаць гэтаму значэння, прамаўчаць. А якую тады ў наступны раз выкіне подласць ананімны «блюсцілець» дзяржаўных інтарэсаў? Прамаўчаць—значыць не толькі не спыніць паклёпу, але нават неяк садзейнічаць стварэнню ўсялякіх «груп» і «лагераў», што, вядома, ніяк не спрыяе ўмацаванню калектыву. Яе калектыву.

Правяраць? Даць паклёпніку повад хоць бы для кароткай злараднасці, псаваць настрой і нервы педагогам?

Выйсце—ні ад каго нічога не ўтойваць. Даўно ўсе прывыклі, што Марыя Мікалаеўна часта бывае на ўроках у сваіх калег. Цяпер яна некалькі тыдняў запар не прапускала ніводнага ўрока ў завуча і ў педагога, на якога ўпала падазрэнне. Пераканалася сама, і галоўнае, пераканаліся ўсе— ананімка хлуслівая. І на бліжэйшым сходзе абсеклі гэтай хлусні і без таго кароткія ногі.

Нетыповы выпадак. Вельмі неахвотна расказвае пра яго Марыя Мікалаеўна. Яе школа, яе жыццё...

У ДЗЕСЯЦЬ гадоў упершыню ўбачыла яна, як паднялися рукі дырыжора і, падпарадкоўваючыся іх рухам, упляла свой тоненькі і няўпэўнены галасок у тканіну песні. Песня засталася з ёю назаўсёды. Ва ўсім «вінаваты» тагачасны кіраўнік хору навабеліцкай фабрыкі «Везувій» Шаршаткін—настаяў, пераканаў і маці, і Марыю. У 1940 годзе яе прынялі на вакальнае аддзяленне Гомельскага музычнага вучылішча. І тады ж пазнаёмілася яна з маладым афіцэрам—артылерыстам Максімавым. За месяц да пачатку вайны яны пажаніліся...

Эвакуацыя. Спачатку Горкі, потым Далёкі Усход. Ёй з дзіцем хапала таго, што атрымлівала па афіцэрскім атэстаце. Але яна працавала, усюды паспявала—і дзіця гадавала, і ў школе спевы выкладала, і ў канцэртах удзельнічала. Была з людзьмі—лягчэй было чакаць пісем з фронту, не было пакутлівых «пустых» вечароў, калі ўсялякія кашмары ў галаву лезуць.

У вызваленым Гомелі ў сорак чацвёртым годзе яе прынялі на другі курс вучылішча. Апроч таго, адразу ж пастуціла яна на работу ў дзіцячы дом—выхавацельніцай. І галоўнай лічыла іменна гэтую работу—з дзецьмі, якіх вайна зрабіла сіротамі. Аўтобусы не хадзілі, мерала кожны дзень кіламетры ад Гомеля да Нова-Беліцы—там знаходзіўся дзіцячы дом. Па слоце, па марозе. Нікому не скардзілася і цяпер успамінае той час—нялёгкі, але шчаслівы, час працы і клопату.

У 1947 годзе скончыла вучылішча.

Працаваць яе накіравалі ў Мазыр, як я ўжо гаварыў, адразу дырэктарам музычнай школы. Васемнаццаць гадоў на адным месцы, на цяжкай і адказнай рабоце—дата хоць і не круглая, але ўнушае павагу. Прыехала—школа ў старым памяшканні, педагогаў няма, інструментаў няма. Дырэктар, завуч, загадчык гаспадаркі, касір, бібліятэкар—вось яе абавязкі ў першыя гады. Дадайце сюды канцэрты, заняткі ў хоры—не магла ж яна не пайсці туды. Людзі і цяпер здзіўляюцца—калі яна паспявала сям'ю дагледзець і адпачываць. Паспявала. Праўда, спала, бывала, па пяць гадзін ў суткі... Адкуль толькі сілы браліся? А цяпер справы іншыя і размах іншы.

— Цяпер усё залежыць ад нас саміх,—гаворыць Марыя Мікалаеўна.

Напэўна, пра работу школы, пра тое, як яна стала сапраўдным культурным цэнтрам горада, варта было расказаць асобна. Усё ж—вельмі коратка: у Мазыры не памятаюць ніводнага свята, ніводных выбараў, каб вучні не выступалі з канцэртамі.

Унутрышкольныя мерапрыемствы — гэта добра абдуманы комплекс вечароў, сустрэч, канцэртаў—усё для павышэння эстэтычных ведаў вучняў. Насценгазета, арыгінальная электрычная музычная віктарына, музычны каляндар—і некаторым гомельскім музычным школам можна было б павучыцца. На грамадскіх асновах пры школе навучаецца штогод некалькі калгасных баяністаў, ёсць свой хор, свой аркестр.

МАРЫЯ Мікалаеўна вельмі далёкая ад таго, каб прыпісваць усе гэтыя добрыя справы сабе—калектыў, ведае яна, сіла вялікая, і ў тым, што ў школе ўсё добра,—яго заслуга.

А яна—дырэктар... Гэта яе школа і ўсё, што робіцца тут,—гэта яе жыццё.

І дзеці—іх у яе чацвёра. Выраслі—малодшы ўжо ў сёмым класе, дзве дачкі ўнаследавалі матчыну любоў і—хочацца верыць—здольнасці, займаюцца ў музычным вучылішчы.

Успамінаю—чытаў у газеце, што на заводзе меліярацыйных машын арганізавана музычная студыя. Марыя Мікалаеўна задаволена:

— Наша выпускніца там працуе...

Д. РАДЗІНСКІ,
кар. «Літаратуры і мастацтва».

Мазыр—Гомель.

калектыву!), думаем сваё, сённяшняе: не так, не так, браткa...

І разумеем Васіля, і ад усяго сэрца зычым яму, каб у новым жыцці, куды ён прыйдзе — абавязкова прыйдзе! — ніколі не сустракаліся яму перааранае поле, бязглуздая ломка, чэрствасць і недавер з недаступных нашаму розуму «вышэйшых меркаванняў»...

Так мы ўваходзім у другі — пераважна публіцыстычны, «мысліцельны» — круг рамана «Подых навальніцы», і самая прыкмегная, значная фігура ў ім — наш стары знаёмы, старшыня райвыканкома, таварыш Апейка.

ДАЎНО мы не сустракалі ў нашай прозе вобраза кіраўніка-камуніста з такім шырокім дыяпазонам інтарэсаў і думак, з такой цікавасцю да самых складаных пытанняў жыцця, як Мележаў Апейка.

Стварыць такі вобраз звычайна даволі цяжка: з прычыны духоўнай блізкасці да героя пісьменнік «перадавярае» яму сваё, запаветнае, не заўсёды клапоцячыся аб тым, каб яно і для героя стала неад'емнае, кроўнае, сваё. І выяўлялася б аб'ектыўна — натурай, характарам.

У мяне, чытача, склалася ўражанне, што ў «Подыху навальніцы» Мележ не да канца пераадолеў гэту цяжкасць.

Пісьменніку карцела выказацца па многіх праблемах, і ў радзе выпадкаў ён, не задумваючыся, упаўнаважвае гэта зрабіць Апейку. Той выказваецца, і найчасцей змястоўна, востра, нетрафарэтна, але, на жаль, не заўсёды ёсць адчуванне, што Апейка гаворыць толькі вынашанае і перадуманае самім сабой. Ад разнастайнага мноства праблем вобраз пачынае крыху расплывацца, траціць сваю акрэсленасць, ператвараецца ў даверaную асобу аўтара.

Скажам, я не зусім упэўнены, што ў такім рамане, як «Подых навальніцы», дзе «гаручага матэрыялу» хапае і так, павінна была заняць вялікае месца гісторыя (сама па сабе праўдзівая) цкавання паклёпнікамі і кар'ерыстамі маладога паэта Алеся Маёвага, гісторыя, у якой Апейка выступае, натуральна, у ролі заступніка за свайго былога вучня, цяпер «сталінчага» паэта.

Адцягнена, па-за характарам і неяк вельмі па-сучаснаму гучаць дыскусіі Апейкі з Алесем аб тагачасных літаратурных арганізацыях, аб Цішку Гартным. (Дарэчы, у гэтых дыскусіях Алесь відавочна трымаецца ўзроўню сённяшняга «соискателя»-дысертанта: «...ён (Гартны) першы ў нашай літаратуры выбраў сваім генаропм рабочага». А следам — больш чым наіўныя — але зноў па-за характарам — разважанні аб «памылках» Талстога!).

У гэтым Алесі Маёвым, так, як яго рэкамендуе Апейка, залішне выпуклены, як мне здаецца, нэндза і шарачок, — людзі яго пакалення прыходзілі ў літаратуру з большым наборам, з большай — і весялейшай — прагай самасцвярджэння.

І яшчэ адзін пралік чыста мастацкага парадку. Апейка расказвае пра школьныя гады Алеся, і расказвае так, быццам гэта было з ім, з Апейкам, а не з другім чалавекам: «Што ні крок — то па пояс, па грудзі ў снег, знясіліўся ўшчэнт. Другі раз—быў месячны вечар, мароз прадзіраў рэбры...» і г. д. Чые перажыванні, чыя «суб'ектыўная камера» вядуць расказ?..

Затое пра сваё, пра тое, што поўніць розум і сэрца, Апейка нярэдка думае халадавата, быццам «па пісаным»: «Не толькі аратыя з коньмі — нястомныя трактары, пыхкаючы сінім дымам, гаманіва, па-маладому порстка, рушаць, як новыя працаўнікі, пачынальнікі новых, знаных пакуль толькі ў марах, часоў».

І. Мележ спрабуе рамантызаваць Апейку, і гэта было б няблага, калі б ва ўнутраныя маналогі героя, чалавека з надзвычай моцным адчуваннем рэальнага, не прымешваліся настрої, па самой сутнасці яму чужыя: «Можа таму так востра чуеш прыроду, што бачыш, колькі яшчэ сярод людзей ёсць нялюдскага. Чыстая паэзія і зямная, з брудам, з гразёю, проза поўняць яго жыццё». Што за дзіўная, «семінарская» філасофія і пры чым тут Апейка, нястомны працаўнік, гатовы горы перавярнуць, каб «зямная, з брудам, з гразёю, проза» стала паэзіяй, і зусім не «чыстай», а зямной?

Нельга «ажыўляць» героя праз тое, што дасі яму фарсануць банальнай ідэйкай, альбо раптам прымусіш успомніць... Блока («Спакой нам толькі сніцца, праўду казаў Блок»), ці паразважаць «пра недаступныя таямніцы паэзіі».

Не «ўцепліш» героя, калі яму не хапае ўласнай крыві, дзвюма-трыма прахадныя старонкамі пра дом, пра сына з канькамі і жонку, што «жыве... не толькі домам — актыўным грамадскім жыццём»... Хто-хто, а Іван Мележ, аўтар «Людзей на балоце», добра ведае, што ў сапраўднай прозе не бывае нічога «службовага», узятага прыхапкам, каб нешта ўраўнаважыць ці адцяніць...

Значыць, Апейка — няўдача пісьменніка? Ні ў якім разе. Удача, прычым прынцыповая, такая, што адкрывае новыя далягляды праўды ва ўсёй нашай прозе.

Яшчэ раз скажу: нямнога ў нас герояў, якія б так смела, сумленна, з пачуццём высокай грамадзянскай адказнасці падыходзілі да самых складаных і супярэчлівых з'яў рэчаіснасці, як гэта робіць Апейка.

Самаадданы, ідэйны камуніст, удзельнік грамадзянскай вайны, адзін з радавых будаўнікоў новых, савецкіх, форм жыцця. Апейка ясна ўсведамляе гістарычную неабходнасць калектывізацыі і, не шкадуючы сябе, упарта і цярпліва вядзе работу, каб былі выкананы прадвызначэнні Леніна, партыі. Іменна намаганнямі такіх людзей, як Апейка, якія заўсёды абапіраліся на творчую самадзейнасць мас, на іх разумную ініцыятыву, і перамагла справа Леніна, усталяваўся і вытрываў найцяжэйшыя выпрабаванні, у тым ліку і ваенныя, калгасны лад у нашай краіне.

Людзі, падобныя да Апейкі, стаялі пры самым вытоку нашых агромністых дасягненняў, але і яны ж — і пра гэта, здаецца, першы ў нашай літаратуры гаворыць І. Мележ — бачылі ўзнікненне такіх тэндэнцый, што «поўнілі душу неспакоем, чуцём небяспекі» і сталі прычынай многіх і многіх цяжкасцей пазнейшага часу.

Асабіста для Апейкі пачалося як быццам з дробязі — ідуць нарыхтоўкі, марудна ідуць, і «што ні дзень—званкі, запытанні: як з нарыхтоўкамі, як план?.. накачкі: падводзіце акругу!»... Сам падганяеш ужо і сам накачваеш, хоць часта бачыш, што ўсё гэта і не трэба... Спакой, дзелавітая разважнасць не ўдаюцца».

Далей усё больш і больш асталёўваецца нейкая неразумная «просталінейнасць, якую невядома чаму завуць прынцыповасцю, хоць гэта найчасцей чэрствасць... Ды яшчэ выдаюць за знак асаблівай «рэвалюцыйнасці».

Апейка «скампраметаваны»: ягоны брат, які ў гады грамадзянскай вайны дапамагаў нашым, чырвоным, пазней стаў кулаком, і на гэтай акалічнасці выязджаюць тыя, хто дамагаецца выключэння Апейкі з партыі. Сам жа ён разважае так: «Родны брат. Гэта праўда. Але ж гэта, калі задумацца, яшчэ лепш гаворыць пра тое, як неразумна дабівацца дыстыляванай чысціні ў біяграфіі па часці сваякоў... Чаму такі клопат пра ідэальную біяграфію часта куды большы, чым клопат пра ідэальнасць дзейнасці чалавека!»

А вось яшчэ адзін брат. Але ўжо не Апейкаў — Яўхімаў. Сын і брат кулакоў, які не хоча жыць па-кулацку: «Цяпер — калі ўсё пачынае па-новаму быць... Счапіліся адзін раз як не загрудкі. Я і кінуў. Пайшоў жыць на волю. Як усе людзі...» Апейка паверыў. Сцяпану: «От яна—новага сіла, ад самога Глушакова дрэва адрываце галіны...» А на чыстцы ячэйкі, там, дзе дэмагогі тыпу Галенчыка, члена камісіі, шукалі толькі «кампраметуючага», яму, Апейку, паставілі і гэта ў віну: апартунізм.

А пошасць падазронасці, недаверу пад выглядам рэвалюцыйнай пільнасці! Не абганяючы свой час, цалкам застаючыся ў яго граніцах, Апейка і тут «намякае» на тыя пачварныя з'явы, якія былі пазней рашуча асуджаны і выкрыты партыяй, яе гістарычным XX з'ездам... А што, думае Апейка, «калі хваля падазронасці разальецца шырока?.. Калі будуць падтрымліваць усякага, каму не цярпіцца секануць з-за пляча? Усякага, каму хочацца — для справы вядома! — надзвычайных мер і правоў?» (Тонкай іроніяй гучыць гэта «для справы, вядома!»)...

Усе гэтыя тэндэнцыі, якія так балюча ўспрымае Апейка, — не цені, не бесцялесныя прывіды, яны маюць у рамане сваіх канкрэтных носьбітаў: Башлыкоў, Галенчык, Кудравец, і з імі спрачаецца, іх стараецца пераканаць герой рамана. І ён не адзін — разам з Апейкам — яго аднадумцы, яго таварышы па ленінскай партыі: стары камуніст Белы, старшыня сельсавета Гайліс, народ, які адчувае праўду і хіліцца да яе.

Апейка — галоўны герой рамана «Подых навальніцы», адзін з галоўных герояў рамана. Ён з найбольшай паўнатой выяўляе народную думку твора, тую адзіна плённую канцэпцыю жыцця, якая ўлічвае складанасць гістарычнага моманту і падыходзіць да яго з рэальнай, а не дагматычна-валюнтарысцкай мерай.

Вядома, Апейка — не проста «адвакат» Васіля Дзятліка і яму падобных тысяч і тысяч сялян; ён не збіраецца плесціся ў хвасце іх адсталасці, іх ілюзій. Але Апейка разумее, што менавіта з гэтымі Васілямі — інакшых няма і не будзе! — трэба будаваць новае жыццё і таму «трэба да іх справядлівым быць», бо «ёсць у іх свая праўда, ёсць, і няма чаго хаваць гэта», і таму не «папрокі трэба ім цяпер; парада — цвярозая, разумная — от што ім трэба найбольш!..»

Куранёўскія, «васілёвы» сцэны рамана і сцэны гарадскія, «апейкавы»: пластыка быту і працы і публіцыстыка спрэчак і роздуму звязаны паміж сабой не знешне сюжэтна, а іменна думкай аб шляхах народа, аб рэальным пераўтварэнні яго жыцця на новых — сацыялістычных — асновах і, натуральна, аб метадах гэтага пераўтварэння, суаднесеных з высокай мэтай.

Івану Мележу, наколькі я разумею, было надзвычай важна вылучыць і падкрэсліць гэту думку, «ачысціць» яе ад усяго, што часта да яе прыставала, і таму ён нават пайшоў на свядомую «рызыку»: уключыў у раман хроніку, дакумент—вытрымкі з стэнаграмы сесіі ЦВК 20—26 лістапада 1929 года.

Апейка ў Мінску. Мінскія эпізоды рамана маглі быць выпісаны больш натхнёна і «густа», ім не хапае характэрнасці. Не думаю, каб ад мінскага трамвая, упершыню ўбачанага Апейкам, дабавязкова трэба было перакінуць мосцік да міжпланетных ракет, — яшчэ адзін доказ таго, як залішне адвольна «расцягваецца» Апейка, як паслухмяна ён бярэ на сябе ўсё, што ўзвальвае пісьменнік.

Апейка — ўдзельнік сесіі. Мае рацыю аўтар, сцвярджаючы: «Тое, што было ў Куранях, нельга зразумець без гэтага». Бо і тут, на вышэйшай ступені грамадскага жыцця рэспублікі, дзіўна перапляліся рэальна-практычны погляд на справы калгасаў, на іх далейшыя перспектывы — і погляды пражэкцёрскія, парадныя; жывая турбота жанчыны-калгаснікі аб ураджаі, аб школе, аб лазні — і папяровы клопат гаваруна аб папяровых працэнтах і тэмпах; планы па нарыхтоўцы першага калгаснага хлеба — і планы(!) па чыстцы дзяржаўнага апарата ад «ворагаў»... Стракатая, супярэчлівая карціна, дзіўная разнагалосіца — якім рэхам яна адгукнецца ў Куранях?..

...Гартаем апошнія старонкі рамана. Васіль вяртаецца з Юравіч дадому: ішоў да Апейкі скардзіцца на несправядлівасць, і той «стаў яго ўгаворваць уступіць у калгас». Яўхім ідзе ў Глінішчы, да настаўніцы, гразіцца Ганне, «што ёй без яго ўсё адно не жыць, і Ганна не толькі не збаялася, а засмяялася з яго». Давольны сваёй доляй Хоня забірае з калгаса кабылу і воз, пад'язджае з гаманою да Хадосьчынай хаты, а потым, цераз трэблю, да царквы... І аўтар піша:

«Да людзей ішлі нязвыклыя, нязведаныя перамены, якія павінны былі зрабіць усё такім, якім яно не было ніколі. Людзі жылі, як і дзесяць, і сто гадоў, і жылі, як не жыў яшчэ ніхто, ніколі...»

ЧАС ідзе, разгортваюцца падзеі, і разам з ім разгортваецца «палеская хроніка» Івана Мележа — твор шырокага дыхання, спелай грамадзянскай думкі, падрахунак і адкрыццё — сур'ёзная ўдача самога пісьменніка і беларускай прозы ў цэлым.

Наши госці

НА МАНЕЖЫ І ЭСТРАДЗЕ

У беларускай сталіцы адначасова гастраліруюць два замежныя калектывы — артысты эстрады Чэхаславакіі і артысты цырка ГДР.

Гэтыя здымкі нашы фотакарэспандэнты зрабілі ў канцэртнай зале філармоніі і на манежы Мінскага цырка, дзе выступаюць госці.

Злева — чэхаславацкая спявачка Даша Картэзава, справа — удзельнікі паветранага атракцыёна артысты Бералінас.

На той бок

ТЭАТР «АМБІГЮ» ПАД ПАГРОЗАЙ

Парыжскі тэатральны свет і аматары мастацтва ў хваляванні: пад пагрозаю лёс аднаго са старэйшых французскіх тэатраў, «Амбігю». Смяротны прыгавор «Амбігю» ўжо вынесены, і яго сцены не сёння-заўтра могуць быць разбіты кіркамі і бульдозерамі. Авеяны славай будынак, які бачыў многія пакаленні французскіх акцёраў і нібы захоўвае водар дарагіх французскаму мастацтву ўспамінаў, прададзены на злом.

Тэатр «Амбігю» быў заснаваны амаль дзвесце гадоў назад, у 1769 годзе. Спачатку там ішлі спектаклі марыянетак, і вечарамі сцены тэатра скаланаў магутны рогат дужых рамеснікаў, якія пацяшаліся над прыгодамі дурасліваго Палішынеля. Потым прыйшла чарга пантамім, якія размгрывалі дзеці і падлеткі. Пазней настала пара феерый і меладрам, і «Амбігю» вельмі хутка заняў віднае месца ў тагачасным тэатральным жыцці сталіцы.

У 1827 годзе стары будынак тэатра згарэў пры пажары, што ўспыхнуў ад феерверка, «цвіка» чарговай феерыі. Непадалёку ад пажарышча, на Вялікіх бульварах быў пастаўлены новы будынак «Амбігю». Немагчыма пералічыць нават самыя цікавыя пастаноўкі, якімі адзначана двухвяковае існаванне «Амбігю». Тут упершыню парыжскі глядач знаёміўся з творамі Аляксандра Дзюма і Эміля Заля, тут ішлі п'есы Шэкспіра і Жорж Санд, Куртэліна і Сарду. У апошнія гады тут выступаў славуты французскі мім Марсель Марсо.

Але гады прыносяць не толькі славу, але і старасць. «Новы» будынак «Амбігю», які капітальна рамантаваўся ў канцы мінулага стагоддзя, цяпер прыйшоў у заняпад. Для рэстаўрацыі тэатра патрэбна некалькі мільёнаў франкаў, сума вялікая, а дзе яе ўзяць? Ад дзяржавы «Амбігю» не атрымлівае ніякіх датацый, а збораў ледзь хапае на ўтрыманне артыстаў і выплату ўсялякіх падаткаў. Дзе ўжо тут думаць пра нейкія новыя дарагія пастаноўкі. Вось ужо некалькі гадоў тэатр б'ецца у сецях нявыплачаных даўгоў, але толькі ўсё больш у іх заблытваецца.

Цяперашні дырэктар «Амбігю» Анры Казадзесю «званіў,—як ён выказаўся,—ва ўсе званы», стукаў «ва ўсе дзверы». Беспаспяхова. На працягу чатырох гадоў ён дарэмна спрабаваў звярнуць увагу ўладаў на тэатр, які гіне, але так нічога да гэтай пары і не дамогся.

Цяпер спектаклі ў «Амбігю» ўжо спынены, камедыя Франсуа Шампо «Сардэчныя дзеці», якая ішла тут, часова пераведзена на сцэну «Тэатра Эдуарда VII». За апусцелымі кулісамі чуваць стук і трэск: рабочыя разбіваюць тэатральныя канструкцыі, вывозяць дэкарацыі. Вялікі арган ужо дэманціраваны, жалезныя процівагі, якія служылі для ўстойлівасці дэкарацый, прададзены як металалом. Будаўнічая кампанія «Сепрымо», якая купіла ўчастак, вось-вось прыступіць да яго «расчысткі», намерваючыся ўзвесці на гэтым месцы новы гандлёвы комплекс або прасторны гараж для аўтамабіляў.

Лёс, падрыхтаваны «Амбігю», глыбока ўстрывожыў парыжан, тым больш што амаль у такім жа становішчы апынуўся другі папулярны тэатр сталіцы «Гэтэ лірык» і такі ж лёс пагражае яшчэ добраму дзесятку парыжскіх тэатраў. Прычыны ўсё тыя ж: улады не толькі не хочуць аблегчыць тэатрам іх матэрыяльнае становішча, але, наадварот, нароваць атрымаць з іх больш даходаў, абкладаючы відовішчныя прадпрыемствы непамерна высокімі падаткамі. З шасці дзесяткаў тэатраў, што існуюць у Парыжы, толькі шэсць атрымліваюць дзяржаўныя датацыі.

Многія дзеячы культуры і мастацтва блізка да сэрца прынялі лёс старога тэатра, які паслужыў на славу французскай сцэны.

Вядомы драматург Арман Салакру, відныя пастаноўшчыкі Жан Вілар, Жан-Луі Баро і рад іншых стараюцца цяпер выратаваць «Амбігю». З гэтай мэтай створана Асацыяцыя абароны тэатра, якая пачала збор сродкаў з мэтаю выкупу «Амбігю» ў кампаніі «Сепрымо». Ці хопіць, аднак, добраахвотных ахвяраванняў, каб сабраць такую вялікую суму —восем мільёнаў франкаў?

Без умяшання ўлад стары тэатр асуджаны на смерць.

Ю. ЛАПАЦІН,
карэспандэнт ТАСС.

Парыж.

РУБАЙІ АМАРА ХАЙЯМА

Восем з палавінаю стагоддзяў на старых могілках Іранскага горада Нішапура кожную вясну пяшчотныя пялёсткі з квітнеючых дрэў асыпаюць магілу Амара Хайяма. І восем з палавінаю стагоддзяў непераўзыходзячай любоўю чалавецтва карыстаюцца яго неўміручыя рубайі.

Сярод многіх соцень перакладаў Хайяма на мовы амаль усіх народаў свету пераклады рускіх паэтаў займаюць адно з вядучых месц. Аматары ўсходняй паэзіі змогуць цяпер яшчэ раз атрымаць асалоду ад глыбіні роздумаў і чароўнай прыгажосці рубайі ў перакладах савецкага паэта Уладзіміра Дзяржавіна. Новы зборнік Амара Хайяма выпусціла Таджыкскае дзяржаўнае выдавецтва «Ірфон». Гэта адзін з найбольш ёмістых зборнікаў Хайяма на рускай мове. У кнігу ўвайшлі 488 чатырохрадкоўяў. Апроч рубайяў, якія несумненна належаць Хайяму, перакладчык уключыў таксама рад вершаў спрачнага аўтарства, але выключна блізкіх па духу і мове класічу паэзіі сярэдневяковага Усходу. У падрыхтоўцы новага выдання перакладаў удзельнічала група філолагаў Масквы і Душанбе.

Складальнік і галоўны рэдактар кнігі—кандыдат філалагічных навук Камол Айні.

Зборнік «Рубайі Амара Хайяма» выдадзены стотысячным тыражом.

ТАСС.

БЫЦЦАМ ПАЛЯРНАЕ ЗЗЯННЕ

У сувязіста Паўночна-Казахстанскага раённага цэнтра Булаева Генадзя Ягорава два захапленні — радыётэхніка і музыка. І дома ўсё што можна ў яго даўно радыёфікавана і агучана. Аднак сябры, якія нядаўна сабраліся ў Ягорава на хатні канцэрт, зноў былі здзіўлены навінкаю.

Калі загучалі акорды Чайкоўскага, у пакоі пагасла святло. У той жа момант экран, прымацаваны на сцяне, успыхнуў непаўторнай каляровай гамай. Інтэнсіўнасць колераў і іх спалучэнне, у залежнасці ад характару музыкі, няспынна змяняліся. Гэта было падобна на незвычайна чароўнае палярнае ззянне і вельмі ўзмацняла ўражанне ад музыкі.

Каляро-музычная аматарская паўправадніковая ўстаноўка Генадзя Ягорава працуе выдатна. Усе цяжкасці яе канструявання ён пераадолеў самастойна. У папулярнай радыётэхнічнай літаратуры схемы падобных прыстасаванняў яшчэ не публікаваліся.

Зрэшты поспех Ягорава вытлумачыць не так ужо цяжка. Як паведамляе газета «Молодой целинник», якая расказала пра незвычайныя канцэрты ў Булаеве, Генадзь Ягораў не толькі здольны аматар, ён студэнт-завочнік політэхнічнага інстытута. Цяпер Ягораў задаўся мэтаю сканструяваць электрамузычны інструмент, які б сам рабіў каляровую развёртку да выконваемых на ім твораў.

АДН.

ВАЧЫМА ШАСЦІГАДОВЫХ

У гэтых цацак няма кляйма «Зроблена ў СССР». Яны наогул не маюць фабрычнай маркі. Іх зрабілі самыя юныя майстры далёкаўсходняга горада Хабараўска, якім споўнілася па пяць-шэсць гадоў.

Цацкі ледзь змясціліся ў вялізнай зале, дзе Хабараўскі гарадскі аддзел народнай асветы арганізаваў выстаўку творчасці выхаванцаў дзіцячых садоў.

Маленькія майстры лепяць і будуюць тое, што бачаць і што хочуць бачыць вакол сябе. Лялька ў белым халаце, у шапачцы з чырвоным крыжам, са стэтаскопам у руцэ важна сядзіць за сталом. Лыжніца ў спартыўным касцюме, лётчык, даярка—людзі гэтых прафесій часта праходзілі перад вачыма малышоў з дзіцячага сада № 5 і яны апранулі сваіх лялек у прафесіянальную вопратку. «Верталёт з пасажырамі» зроблены ў другім дзіцячым садзе, а кампазіцыі на тэму «У свеце казак» — у трэцім.

Творчыя і дыдактычныя гульні, простыя — такія, як «Чыё гэта лісце?» (лісце розных дрэў акуратна наклеена на шчыльную кардонку), і больш складаныя — «Правілы вулічнага руху», «Касмадром», «Магазін з таварамі». Усё, што звязана з працаю, з мірам, ніводнай цацкі, звязанай з вайною.

Свет вачыма малышоў—так называюць тут гэтую цікавую выстаўку.

— Мы праводзім падобныя выстаўкі кожны год,—сказала карэспандэнту АДН метадыст гарана Лідзія Мікалаеўна Аляксандрава, —і кожны год усё больш і больш экспанатаў, усё больш і больш удзельнікаў. І гэта не дзіва—расце колькасць дзіцячых садоў — за сёлетні год чатыры адкрыта і сем гатовы да здачы, а за шэсць год у горадзе з'явілася 59 новых дашкольных дзіцячых устаноў.

АДН.

ЦІКАВЫЯ ЗНАХОДКІ

У Мінскі абласны краязнаўчы музей у горадзе Маладзечна паступіў клад манет, знойдзены ў вёсцы Ваўчкі Хоўхлаўскага сельсавета Маладзечанскага раёна. Манеты знайшла калгасніца М. Зянько. У гаршку, у якім знаходзіўся скарб, налічвалася больш 200 манет XVII—XVIII стагоддзяў. Недалёка ад месца, дзе захоўваўся гаршчочак, быў знойдзены яшчэ адзін клад манет.

З. КАХАНОЎСКАЯ.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЕ ЗА РУБЯЖОМ

АПЛАДЫСМЕНТЫ САВЕЦКІМ ФІЛЬМАМ

Яркае святло неонавых рэклам кінатэатра «Камера» маляўніча адбіваецца ў вадзе цёмнага вузкага канала на «Аудэ Храхт» у горадзе Утрэхтэ. Ля ўваходу ў кінатэатр незвычайнае ажыўленне. Пад'язджаюць аўтамашыны, спыніць чарга за білетамі. На велізарнай светлавой дошцы аб'ява: сёння ўвечары ў кінатэатры дэманструюцца савецкія фільмы «Яўгеній Анегін» і «Крыштальны чаравічак». Да фатаграфій, якія паказваюць асобныя кадры з кінафільмаў, прабіцца немагчыма. Адзінока ў баку глядзяць у ваду канала каляровыя фатаграфіі паўголых амерыканскіх кіназорак. Сёння пра іх зусім забыліся.

Публіка самая розная, але галоўным чынам моладзь: вучнёўская, студэнцкая, рабочая. Але тут жа і ўбеленыя сівізною людзі. Усіх прывяло ў залу кінатэатра жаданне ўбачыць частачку Савецкага Саюза, убачыць уласнымі вачыма.

Павольна ўзнімаецца заслона. Узнікаюць чароўныя сцэны балета «Крыштальны чаравічак». У зале напружаная цішыня. Але вось ідуць апошнія кадры фільма. Бурныя апладысменты. Фільм крануў сэрцы гледачоў. «Цудоўна, непаўторна, грандыёзна!» — гаворыць вядомы галандскі вучоны, астраном Мінаерт, які сядзіць побач са мною.

Пасля невялікага перапынку зноў усе гледачы ў зале. Няма ніводнага свабоднага месца —з'ява сама па сабе незвычайная ў галандскім кінатэатры. На долю «Яўгенія Анегіна» выпаў яшчэ больш поспех. Гутару з пажылымі мужам і жонкаю. Абое ўраджэнцы Амстэрдама. Ен—дзялок, уласнік фірмы. «Фільм робіць незабыўнае ўражанне, — гаворыць мой субяседнік. — Мы з жонкаю бывалі ў Мілане, слухалі італьянскую оперу. Аднак савецкая опера пакідае яшчэ большае ўражанне».

У Амстэрдаме ў кінатэатры «Сінетол» таксама з вялікім поспехам прайшла дэманстрацыя савецкіх кінафільмаў «Браняносец «Пацёмкін» і «Маці». Прадстаўнік «Саўэкспартфільма» В. Я. Маяцкі расказвае: «Вялікая цікавасць галандцаў да савецкіх фільмаў. Ужо не толькі ў сталіцы краіны — Амстэрдаме—ідуць савецкія фільмы, іх можна ўбачыць у многіх гарадах Галандыі. Савецкі фільм перастае быць рэдкім госцем.

З вялікім поспехам ідзе дэманстрацыя «Браняносца «Пацёмкіна». Ужо да канца года гэты фільм распісаны па кінатэатрах розных гарадоў Галандыі».

Л. ЛІТВАК,
карэспандэнт ТАСС.

Гаага.

Імя Яна Сібеліуса

МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС СКРЫПАЧОЎ У ХЕЛЬСІНКІ

Музыка Яна Сібеліуса глыбока нацыянальная. І ў гэтым яе вялікае інтэрнацыянальнае значэнне. У ёй адлюстравана радзіма кампазітара—цудоўная краіна Суомі, яе суровая прырода, жыццё і характар народа, склад душы, паданні, эпас. Па гэтай музыцы людзі пазнаюць краіну, яе сумленны, працавіты народ.

Творы Яна Сібеліуса пастаянна гучаць у канцэртных залах Савецкага Саюза, па радыё і тэлебачанні.

Многія савецкія музыканты былі гасцямі Яна Сібеліуса ў Ярвенпяя, паблізу Хельсінкі. Але толькі скрыпачу Ігару Бязроднаму выпаў гонар іграць перад патрыярхам фінскай музыкі яго творы.

У 1953 годзе Бязродны прыехаў у Фінляндыю для ўдзелу ў «Тыдні Сібеліуса». За тры гады да гэтага ў дзень 85-годдзя кампазітара былі ўстаноўлены ў азнаменаванне дня нараджэння Сібеліуса штогадовыя музычныя святы. Савецкаму скрыпачу было прапанавана вывучыць і ўпершыню выканаць з аркестрам дзве серэнады кампазітара. На другі дзень пасля канцэрта Ігар Бязродны і піяніст-акампаніятар Абрам Макараў былі запрошаны да Яна Сібеліуса ў Ярвенпяя.

— Ен сустрэў нас,—успамінае Ігар Бязродны,—поўны энергіі, жыццёвых сіл, задзёрыстага гумару. Па вонкавым выглядзе, па манеры паводзін яму ніяк нельга было даць 88 гадоў. Мы сыгралі дзве яго серэнады. Мне здалося, што яму спадабалася. Ва ўсякім разе, ён сардэчна дзякаваў нам і прызнаўся, што ўпершыню пачуў гэтыя серэнады ў жывым выкананні. Потым мы гаварылі пра музыку. Ен сказаў, што любіць рускую музыку і многаму навучыўся ў рускіх кампазітараў. З Рымскім-Корсакавым ён быў добра знаёмы, а з Глазуновым яго звязвала дружба. Пра савецкую музыку Сібеліус гаварыў як чалавек, які добра яе ведае. Ен паказаў нам на маленькі і даволі стары прыёмнік: «Гэта мае вушы ў свет! Я часта слухаю музычныя перадачы з Масквы і Ленінграда».

На працягу васьмі гадоў «Тыдзень Сібеліуса» праводзіўся пасля смерці кампазітара. Сёлета ён супадае са знамянальнай датай—100-годдзем з дня яго нараджэння. У знак гэтай падзеі ў рамках «Тыдня» праводзіцца Міжнародны конкурс скрыпачоў імя Яна Сібеліуса.

У склад журы ад Савецкага Саюза запрошаны лаўрэат Ленінскай прэміі прафесар Леанід Коган.

Для ўдзелу ў конкурсе ў Хельсінкі паехалі тры выхаванцы Маскоўскай кансерваторыі: Ізабела Петрасян, аспірантка, якая займаецца пад кіраўніцтвам прафесара Юрыя Янкелевіча, аспірант Валерый Градаў, які займаецца ў прафесара Леаніда Когана, і студэнт другога курса па класу прафесара Барыса Кузняцова—Алег Каган.

— Першы тур уключае два складаныя творы для скрыпкі сола Баха і Паганіні,—гаворыць дэкан аркестравага факультэта Маскоўскай кансерваторыі дацэнт Таццяна Гайдамовіч.— У другім туры пэўную цяжкасць уяўляе Пяты канцэрт Моцарта. У трэцім туры стаіць канцэрт Яна Сібеліуса і дадатковы канцэрт па выбару ўдзельніка ад Бетховена да Бартака і Хіндэміта. Такая праграма патрабуе не толькі яркага таленту, але і свабоднага валодання скрыпічнай тэхнікай, глыбокага ведання музычных стыляў, глыбіні інтэрпрэтацыі, вялікага валявога напружання і ўмення правільна размеркаваць свае сілы. Адным словам—конкурс сур'ёзны.

Міхаіл АЛЯКСАНДРАЎ.
(АДН).

Філарманічны КАЛЯНДАР

СНЕЖАНЬ

Канцэртамі артыстаў эстрады Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі распачаўся ў Мінску філарманічны снежань. Да гэтага нашы госці выступалі ў Брэсце, а пасля Мінска накіруюцца ў вялікую паездку па іншых гарадах Беларусі. Канцэрты майстроў чэхаславацкай эстрады ўбачаць гледачы Полацка, Віцебска, Магілёва, Гомеля, Бабруйска, Гродна, Баранавіч, Ліды. У склад групы, якая прывезла да нас паказ «Любімыя мелодыі сяброў», вядомыя выканаўцы муж і жонка Рудольф і Даша Картэз, Іржына Бергерава, Францішак Твардак. У Мінску канцэрты працягнуцца да 5 снежня.

Сёння ў філармоніі выступае чэхаславацкі арганіст Фердынанд Клінда. У праграму канцэрта ўваходзяць творы Баха (Канцэрт рэ-мінор па Вівальдзі, Два харалы, Трыо соль-мажор, Прэлюдыя і фуга рэ-мажор), Каляды Дакена, Харал ля-мінор Франка і Варыяцыі на тэму старадаўняй каляднай песні Дзюпрэ.

Заўтра ў філармоніі вечар французскага піяніста Самсона Франсуа. С. Франсуа закончыў кансерваторыі ў Ніцы і Парыжы (апошнюю па класу Маргарыты Лонг) і ў 1943 годзе атрымаў першую прэмію на першым Міжнародным конкурсе імя Маргарыты Лонг і Жака Цібо. Наш госць—не толькі піяніст, ён — аўтар канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, вальса «14 ліпеня», музыкі да кінафільма «Святочны Парыж». У сезоне 1953-54 гадоў ён атрымаў Гран-пры Французскай акадэміі гуказапісу за лепшае выкананне твораў Шапэна. У час сольнага канцэрта 4 снежня С. Франсуа выканае Варыяцыі на тэму Клары Вік «Матылькі», Санату сі-бемоль-мінор Шапэна, Санату сі-мінор Ліста.

5 снежня французскі піяніст выступіць разам з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР пад кіраўніцтвам В. Катаева і аб'яднаным хорам Беларускага радыё, тэлебачання і кансерваторыі пад кіраўніцтвам В. Роўды. На гэтым канцэрце ўпершыню ў Мінску будуць выкананы Музыка для струнных, ударных і чэлесты Бартака і Сімфонія з хорам Стравінскага. У праграму канцэрта ўваходзіць таксама Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам Пракоф'ева.

З эстрадным тэатралізаваным паказам «Нам толькі што паведамілі» прыязджаюць да нас артысты Ленінграда. У склад групы ўваходзяць вядомыя сатырыкі заслужаны артыст РСФСР В. Нячаеў і лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады Г. Арлоў. Канцэрты ленінградцаў будуць праходзіць з 6 па 12 снежня.

10 і 12 снежня ў філармоніі адбудуцца сімфанічныя канцэрты, прысвечаныя пленуму Саюза кампазітараў БССР. У гэтых канцэртах прымуць удзел Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР і салісты.

Сустрэча з вядомай савецкай піяністкай заслужанай артысткай РСФСР Таццянай Нікалаевай чакае нашых слухачоў 13 снежня. У наступны дзень сольны канцэрт дасць народны артыст БССР, заслужаны артыст РСФСР Ігар Сарокін.

Месяц аказаўся багаты на гасцей. 15 снежня ў нас выступае арганіст з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Амадэус Веберзінке. У праграму ўключана Арганная імша Баха.

16 снежня пачынае гастролі ў Мінску Маскоўскі музычна-драматычны ансамбль (група Аксёнавай-Ардзі). У канцэртным выкананні прагучаць «Васілій Цёркін» (16 снежня), «Пер-Гюнт» (17 снежня), «Арлезіянка» (18 снежня) і «Сон у летнюю ноч» (19 снежня).

20 снежня ў філармоніі выступае заслужаны артыст РСФСР Аляксандр Вядзернікаў (бас).

Аматараў эстрады чакае сустрэча з вядомай выканаўцай песень савецкіх кампазітараў Маяй Крысталінскай (канцэрты 22 і 23 снежня).

24 снежня ўладальнікі абанемента № 12 пазнаёмяцца з майстэрствам заслужанай харавой капэлы УССР «Трэмбіта». У рэпертуары калектыву — творы савецкіх кампазітараў айчыннай і замежнай класікі, украінскія і рускія народныя песні.

Два наступныя вечары канцэртнага зала філармоніі зноў будзе ў распараджэнні аматараў музыкі. Мы запрашаем уладальнікаў абанементаў № 3 (творчасць П. І. Чайкоўскага) і № 5 (для работнікаў аўтазавода).

28 снежня пачынаюцца гастролі групы артыстаў эстрады Грузіі з удзелам сатырыкаў Мераба Жывідзе і Міхаіла Херхеўлідзе і спявачкі Венеры Майсурадзе.

А. КАРДЫМОН,
дырэктар-распараджальнік канцэртнай залы філармоніі.

ЗАГАДКА ЧОРНАЙ ГАРЫ

Бязмежны стэп. Халодная, сумная зямля. Тут ніколі не свеціць людзям сонца. Вечна пакрыта гэтая краіна халодным туманам.

Так уяўляў сабе гэтыя месцы, Крым і Тамань, вялікі паэт старажытнасці Гамер.

Бурныя, неспакойныя воды Чорнага мора здаваліся яго сучаснікам суровымі і небяспечнымі. Нездарма грэкі называлі яго «Пантаксінскі» — негасцінная мора. Такімі ўбачыў гэтыя берагі і легендарны Адысей.

Керч — старажытнейшы горад СССР. Яго ўзрост — больш дзвюх з палавінаю тысячагоддзяў.

Больш дзвюх з палавінаю тысячагоддзяў назад грэчаскія наланісты заснавалі фактарыю Пантыкапей, якая потым стала сталіцаю магутнай Баспорскай дзяржавы.

Здавалася б, час сцёр з памяці людзей падрабязнасці быту і нораваў старадаўніх жыхароў Крыма. Аднак мы ведаем пра сніфаў і сарматаў больш, чым пра некаторыя сучасныя афрыканскія плямёны.

Гэтыя народы зніклі, але за іх гавораць рачы, зробленыя тут жа на месцы або прывезеныя здалёк у абмен на хлеб, каштоўныя футры.

Цяпер робяцца раскопкі аднаго з самых вялікіх на Керчанскім паўвостраве кургановў — Кара-Оба.

Справа незвычайная. Каля ста гадоў мінула з дня раскрыцця кургана Куль-Оба, які прагрымеў на ўвесь свет сваімі скарбамі.

Сто гадоў назад археолагі амаль да самай асновы перакапалі і курган Кара-Оба, але так нічога і не знайшлі. Натнуліся толькі на магутную скалу ў цэнтры, але ні грабніцы, ні нават слядоў яе не заўважылі.

Работы працягваліся тры гады. Археолагі знайшлі ў курганным насыпе некалькі насцякоў, асколкі старажытнага посуду, сляды трызнаў. На гэтым раскопкі скончыліся. Вычарпаліся сродкі, ды і тэхніка таго часу не дазволіла завяршыць работу.

Як быццам бы курган быў даследаваны. І ўсё ж кіраўнік раскопак, дырэктар Керчанскага музея Люцэнка, вымушаны быў у справаздачы напісаць: «Зрэшты, падшва яго не магла быць даследавана на ўсім працягу з-за не надзвычайных памераў».

У 1965 годзе была зроблена новая спроба разгадаць тайну Чорнай гары.

Упершыню ў практыцы археалогіі раскопкі вядуцца на грамадскіх асновах. Прадпрыемствамі Керчы выдзелены цяжкая земляройная тэхніка і свабодныя ад работы людзі.

Работы вядзе кіраўнік экспедыцыі Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР, прафесар Гайдукевіч.

Гайдукевіч — стары керчанін. З 1926 года вучоны кожнае лета прыязджае ў Керч капаць руіны гарадоў Баспора. Сталі яваю старажытная крэпасць Ілурыт, Мерменій — горад вясёлых вінаробаў...

Якія адкрыцці рыхтуе новы курган? Якая яго архітэктура? Мы не агаварыліся. У кожнага кургана на Керчанскім паўвостраве свае, толькі яму ўласцівыя асаблівасці. Гэта не проста земляны насып, а складаная архітэктурнае збудаванне. Для таго каб захаваць грабніцу ад вільгаці і апаўзанняў, зверху яна абкладзена пластам бутавага каменю, потым марской травой, перамешанай з глінай, яшчэ раз каменем і, нарэшце, пакрыта земляным насыпам.

Моцны натрапіўся арэшак, Кара-Оба. Курган устаяў перад тварам доўгіх тысячагоддзяў. Наўрад ці хто здолеў бы дабрацца да яго тайны, калі гэтага не змаглі зрабіць археолагі за тры гады раскопак. Усё гаворыць за тое, што ён дайшоў да нас у поўнай захаванасці.

...Сонца паволі паўзло ў тэніт, павялічваючы спякоту. Гара налілася чорным цёмнем. Цяпер рабілася зразумелым, чаму яе назвалі Кара-Оба, што значыць чорная гара. Велічная вяршыня высока ўзнімалася над далягладам. На фоне яркага паўднёвага неба яна здавалася цёмнай і загадкавай.

Пад нажом бульдозера адкрываецца адтулына, яна ідзе ў глыбіню Чорнай гары. Гэта старажытны ход рабаўнікоў. Спускаемся ў сярэдзіну праходу. Тунэль зігзагамі цягнецца ў целе кургана. Адно з разгалінаванняў упіраецца ў каменную сцяну. Левы калідор праз некалькі метраў заканчваецца тупіком. Па нейкай прычыне рабаўнікам не ўдалося закончыць работу.

У ходзе раскопак выяўлены сляды і больш позніх шукальнікаў шчасця. З-пад нажа бульдозера паявіўся пазелянелы медны прадмет, гэта, відаць, рукаятка ад немудрагелістага рабаўнічага інструменту — кайлы.

Бульдозер натыкаецца на каменную сцяну. Работы спыняюцца. Археолагі, рабочыя збягаюцца да месца знаходкі.

Што гэта, кладка ці якая-небудзь безымянная магіла?

Спецыялісты вызначаюць — кладка. Побач знаходзяцца яшчэ каменні.

Два магутныя крапілы апярэзваюць курган. Яны размешчаны на адлегласці пяці метраў адно ад аднаго і служаць для падтрымкі земляного насыпу. Гэта і ёсць тыя самыя апорныя сцены, пра якія пісаў у сваёй справаздачы Люцэнка.

Зрэдку ў пластах зямлі трапляліся асколкі посуду. Быў знойдзены абломак ляпной мегарскай чашы. Гэтая знаходка памагла вызначыць узрост кургана і трошкі зазірнуць у яго тайну.

Курган насыпаны два з лішнім тысячагоддзі назад у тую неспакойную эпоху, калі Баспор скаланалі няспынныя войны. Вось тут і тоіцца разгадка яго недаступнасці для даследчыкаў. Пахавальную камеру хавалі з такім разлікам, каб агарадзіць яе ад розных выпадковасцей.

У ходзе работ у цэнтры кургана была знойдзена крутая каменная вяршыня. І не ясна, скала гэта ці штучнае збудаванне.

Дзе ж уваход у грабніцу?

Гэта таксама яшчэ застаецца тайнай.

Яна будзе разгадана ў наступным годзе, калі ўзновяцца раскопкі.

Мікалай НЯКРАСАЎ.
Алег ЧЫЛІКІН.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

3 снежня

Першая праграма. 11.00 — «Алымкан». Мастацкі фільм. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для старэйшых школьнікаў. «Ледакол «Красін». Тэленарыс (М). 17.45 — тэлевізійныя навіны. 18.05 — «Трынаццаць». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм. 19.30 — «Наша пошта». 19.50 — Я. Купала. «Паўлінка». Спектакль Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы (трансляцыя па Маскву). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Яны былі на Кубе». Пра матч фехтавальшчыкаў Беларусь — Куба. 22.15 — канцэрт ансамбля Прыбалтыйскай ваеннай акругі.

Другая праграма. 12.00 — тэлевізійныя навіны (М). 12.15 — для вучняў другой змены. «Сто задум двух сяброў» (М). 17.45 — «Светлячок». Мультыплікацыйны часопіс (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Рэпартаж з будучыні» (М). 19.00 — вядомыя спевакі. Ціта Гобі (М). 19.50 — народныя таленты. «Увага! Здымка». «Беларускія напевы». Кінанарысы. 20.30 — «Выцыгін». Мастацкі фільм. 22.00 — у эфіры — «Маладосць» (М).

4 снежня

Першая праграма.

11.00 — «Трынаццаць». Мастацкі фільм. 16.00 — праграма перадач. 16.05 — для дзяцей. «Каток і скрыпка». Кароткаметражны фільм. 16.50 — для малышоў. «Новыя прыгоды Бураціна». Перадача трацяя. 17.15 — для школьнікаў. Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. «Спаборніцтвы кемлівых». Віктарына для аматараў шашак. 3-ці тур. 17.45 — тэлевізійныя навіны. 18.15 — «Сям'я сустрачае свята». Да Дня Канстытуцыі СССР. 18.30 — тэлевізійны клуб кінападарожнікаў (М). 19.30 — першынство свету па мастацкай гімнастыцы. Рэпартаж з Прагі. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Справа «стракатых» Мастацкі фільм. 23.40 — «Вальсы Штраўса». Канцэрт.

Другая праграма. 15.45 — для дзяцей. «Прыгоды Бураціна» (М). 17.00— «Хачу ўсё ведаць». Кінажурнал (М). 17.10 — тэлевізійныя навіны (М). 17.30 — «У свеце гукаў і танца». Перадача з Рыгі. 17.50 — «Веды» (М). 18.30 — «Кюхля». Тэлевізійны спектакль. 20.10 — «Пражскае інтэрмецца». Фільм-канцэрт. 20.50 — «Сямён Сяргеевіч». «Няспетая песня». Кароткаметражныя фільмы. 21.30 — «Заўсёды сябраваць». Кінанарыс 22.00 — канцэрт артыстаў эстрады рэспублік СССР (М).

5 снежня

Першая праграма. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — «Будзільнік» (М). 10.30 — «Валера». Мастацкі фільм. 11.35 — «Дзіцячы аўтазаводскі». Перадача-канцэрт (аб аркестры народных інструментаў аўтазаводскай музычнай школы). 15.05 — праграма перадач. 15.10 — «Навіны дня». Кінажурнал (М). 15.20 — Для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Мацней за сталь». Перадача з Львова. 15.50 — «Музычны кіёск» (М). 16.20 — Канстытуцыя, Артыкул першы (М). 16.50 — тэлевізійныя навіны (М). 17.05 — «Масква ніколі не канчаецца». Прэм'ера тэлефільма (М). 18.15 — першынство свету па мастацкай гімнастыцы. Перадача з Прагі. 19.45 — мастацкі фільм. «Ланцуговая рэакцыя». Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 21.00 — канцэрт Дзяржаўнага рускага народнага хору імя Пятніцкага (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — у эфіры — «Маладосць». Перадача з Кіева.

Другая праграма. 10.30 — для дзяцей. «Армія Трасагузкі». Мастацкі фільм (М). 18.00 — па роднай краіне. «Тры дні на Сахаліне». «На новым месцы». Кінанарысы. 18.40 — канцэрт ансамбля песні і танца Чарнаморскага флоту. 19.45 — «Закон Антарктыды» (М). 21.00 — мастацкі фільм «Яўгенія Гранда». Вытворчасць кінастудыі «Масфільм».

НОВЫЯ ЭСТАМПЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ.

Н. ПАПЛАЎСКАЯ. «Памочніца».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР, рэдакцыйная калегія і супрацоўнікі часопіса «Маладосць» выказваюць глыбокае спачуванне рэдактару аддзела часопіса Веры Сямёнаўне Палтаран з поваду вялікага гора, што напаткала яе,—смерці мужа Ляпескага Франца Іосіфавіча.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 10411